PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 35 (2468) Год XLVIII | Беласток, 31 жніўня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Дзень фактычнай незалежнасці

Яўген Мірановіч

Не ведаю чаму ў беларускай палітычнай традыцыі ці гістарыяграфіі не заўважаецца дата 25 жніўня. У гэты дзень у 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову аб выступленні рэспублікі з Савецкага Саюза. Упершыню ад ранняга сярэднявечча ў Беларусі фактычная і фармальная ўлада была ў руках мясцовых элітаў ды ніхто ў свеце не аспрэчваў гэтага факта.

25 сакавіка 1918 г. беларускія эліты выявілі толькі сваю волю жыць у незалежнай краіне, але ніхто ў Еўропе, апрача ўкраінцаў, не быў зацікаўлены ў існаванні такой дзяржавы. Найбліжэйшыя суседзі — палякі і расіяне — пасля кароткай вайны разграбілі беларускія землі. З незалежнай Беларусі засталася толькі ідэя, у якую з часам верыла штораз менш беларусаў. Мінула пару дзесяткаў гадоў і ў Савецкай Беларусі пераважная большасць жыхароў нават нічога пра тую ідэю не ведала.

Незалежнасць у 1918 г. была аб'яўлена пасля некалькіх спробаў паразумення з расіянамі. Спачатку з правымі дэмакратамі, пасля сацыял-дэмакратамі, а ў канцы — з бальшавікамі. Усе адмаўляліся прызнаць беларусаў як асобную нацыю і шанаваць іх культурную адметнасць. Беларусы, як украінцы, латышы і эстонцы, хацелі жыць у Расіі і карыстацца толькі культурнай і палітычнай аўтаноміяй. Не дачакаўшыся станоўчага адказу з боку бальшавіцкага кіраўніцтва імперыі, усе малыя народы рушылі будаваць свае суверэнныя краіны. Некаторым, як літоўцам, латышам, ці эстонцам, нават пашанцавала. Амаль дваццаць гадоў жылі ў сваіх дзяржавах.

Пад канец васьмідзесятых гадоў канструкцыя бальшавіцка-расійскай імперыі моцна пахіснулася. Спробы рамонту ўчыненыя Міхаілам Гарбачовым закончыліся фактычным яе развалам. З гэтай руіны ўцякалі ўсе народы. Беларусы беглі як адны з апошніх, разам з малдаванамі і азіяцкімі плямёнамі. Але гэтае спазненне было толькі парумесячнае, таму што палітычныя падзеі вымушалі чарговыя рашэнні рэспубліканскага кіраўніцтва. У Маскве галоўны канкурэнт Гарбачова, Барыс Ельцын, дэманстратыўна выкінуў камуністычны партбілет і быў абраны першым прэзідэнтам суверэннай Расіі. Камуністычнае кіраўніцтва Беларусі мела аб чым думаць. Улада ў рэспубліцы незаўважна пераплыла з Цэнтральнага камітэта КПБ у Вярхоўны Савет.

27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет па прапанове дэпутатаў Беларускага народнага фронту прыняў дэкларацыю аб суверэнітэце рэспублікі, у якой у 12 ар-

[працяг ☞ 4]

Фота Ганны Кандрацюк

У Пружанах запанаваў татальны рамонт

Напярэдадні дажынак у Пружанах

Уся Беларусія нам зайздросціць!

Ганна Кандрацюк

Пасярэдзіне Дома культуры ў калгасе Свіслач стаяць жытнёвыя снапкі. На сценах савецкі герб і Ленін.

— А ў нас дажынкі! Прыязджайце на танцы, — запрашае дырэктарка, якая самотна ўвіхаецца каля снапкоў. — Будуць калекцівы, віншаванні, гасціна...

— А можа прэзідэнт будзе?

— Да, — кідае няўпэўнена жанчына, — вродзе бы, да!

* * *

У Пружанах, дзе 20 верасня адсвяткуюць цэнтральныя дажынкі, таксама чакаюць Аляксандра Лукашэнку. З гэтай нагоды ў мястэчку пабудавалі пляцоўку для пасадкі верталёта.

Візіт першага госця, як і ў калгасе Свіслач, застаецца няпэўным.

— А раптам, калі завітае на машыне? Возьме і прыедзе на джыпе, — разважае дзядзька з рамонтнай брыгады. — І невядома з якога боку Ён з'явіцца. Ці ад Слоніма, ці ад Баранавіч?

З-за няўпэўненасці пад рамонт пайшлі ўсе ўязныя дарогі ў горад.

— А, раптам як прыплыве па рэчцы Мухавец?

— Па рэчке? — будаўнік уміг ловіць жарт. — А ў нас ёсць яшчэ падзямельны ход, но он загружэн.

Тунель даўжынёю за дваццаць кіламетраў спалучаў замкі ў Пружанах і Ружанах. Паводле легенды, ход пракапаў закаханы граф, які ў тунелі сустракаўся з графіняй.

* * *

— Мясцовы граф цікавіўся астраноміяй, — дырэктар музея, Юрась Зялевіч, звяртае ўвагу на вежу ў палацы ў стылі італьянскага рэнесансу. — Зараз у сядзібе, пабудаванай маршалкам Швыкоўскім у сярэдзіне XIX стагоддзя, працуе музей. Тут таксама ідзе рамонт — аднаўляюцца інтэр'еры, парадкуецца парк і наваколле, пракладаюцца новыя водаправоды і газаправоды, тэлефонныя лініі. Тут, ля палаца, будуць праводзіцца дажынкі.

— Тыдзень таму мы адкапалі скарб, — дырэктар вядзе нас у будынак былой аранжарэі. — Менавіта тут адкапалі арсенал — французкую зброю з 1812 года. Прыязджала тэлебачанне, прэса.

Фота Ганны Кандрацюк

Юрась Зялевіч

— Тады ў вас будзе цікавая экспазіцыя ў музеі?

Замест адказу — няўпэўненасць. Ці каштоўная знаходка вернецца ў Пружа-

[працяг ☞ 2]

Хто ў Пушчу, а хто па дровы ☞ 2

Апошнія гады для беларускай часткі Белавежжа сталі сапраўдным выпрабаваннем. Як паведаміў у эксклюзіўным інтэрв'ю „Ніве" беларускі эколаг і журналіст, кіраўнік грамадскай ініцыятывы „Terra-канвенцыя" Валерый Дранчук, сённяшнія ўладары Пушчы наважаныя толькі браць ад яе і нічога не аддаваць.

Грабарка 2003 ☞ 3

У гэтым годзе святкаванні на Святой Гары Грабарцы пачаліся раней чым у мінулых гадах ды прыцягнулі мноства праваслаўных вернікаў. Першымі прыйшлі паломнікі з Гайнаўкі. На наступны дзень далучыліся да іх пешаходныя паломніцтвы з Саколкі і Бельска-Падляшскага, а праз два дні — паломнікі з Беластока.

Даўней студні капалі ☞ 4

Са знаходкай вады бывала па-рознаму. Здаралася, што пасля прабіцця гліністага грунту вада пачынала раптоўна біць струяй і капальнік уцякаючы на драбіну няраз губляў боты. Небяспечна было, калі капальнік натыкаўся на г.зв. мулік. Тады трубы так хутка пагружаліся ў грунт, што капальнік не паспяваў выбіраць зямлю.

Скансэн са страусамі ☞ 5

У абодвух яго дамах знаходзяцца гліняныя печкі. У памяшканнях, прыстасаваных да музейнай дзейнасці, знаходзяцца даўнія прылады працы, гліняныя гаршкі і міскі, драўляныя лыжкі, калыска і вышыўка на старой пасцелі. Побач саламяных вырабаў стаяць кошыкі з ракіты. Рамантуюцца яшчэ памяшканні, у якіх будуць жыць турысты.

У Расіі ☞ 8

Беларускі пагранічнік папярэдзіў, што адпраўляючыся ў Маскву або Пецярбург, трэба паведаміць аб гэтым ужо на мяжы. Па прычыне апошніх тэрактаў вядзецца рэгістрацыя ўсіх прыбываючых у самыя вялікія гарады Расіі. Хаця білеты з Брэста ў Маскву былі даволі дарагія — каля 40 долараў за месца ў купэ — і кожны дзень праязджае па гэтым шляху шмат хуткіх пасажырскіх цягнікоў, але свабодных месцаў было малавата і спаць давялося на верхніх полках.

Якасць паляўнічага ☞ 8

Паляўнічыя гурткі ў рамках вучэння сваіх членаў штогоду арганізуюць мерапрыемствы, якія называюць гурткавымі спаборніцтвамі або стралковымі вучэннямі. Правяраюцца тады стралецкія ўмеласці паляўнічых ды выпрабоўваецца неабходную па паляўнічым статуце прыстрэлку ружжа з абсталяваным аптычным прыцэлам.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Палац у Пружанах — тут адбудуцца дажынкі

Уся Беларусія нам зайздросціць!

[1 ☞ працяг]

ны, ніхто не ведае — пакуль „скарбам" заняліся даследчыкі.

Юрась Зялевіч прапануе наведаць месца бітвы 1812 г. у недалёкім лесе, там капліца ў гонар загінуўшых у бітве пад Гарадзечнам.

* * *

— Не думайце, уся Беларусія нам зайздросціць, — заяўляе падвыпіўшы рабочы. Стаім у цяньку пад стогадовым дубам у палацовым парку. Гутарым пра жыццё.

— А ў нас цяпер як у Маскве. Уся краіна тут. Уся Беларусія тут. Прыезджых больш чым мясцовых, — ганарыцца дзядзька. Ахвотна расказвае пра начное жыццё Пружан. Найбольш цікава ў г.зв. „вясёлым доме", дзе „песні з вечара да утра". Апрача песень ёсць і іншыя атракцыёны: дзевушкі, гарэлка.

— А якія інвестыцыі?

Апрача верталётнай пляцоўкі ў Пружанах пабудавалі заправачную станцыю, новыя прыпынкі, платы, паставілі новыя будынкі.

— Беда, што толку нету, — крытыкуе парадкі субяседнік. — Хаця б у нашым парку: найперш пасеялі траву, а пасля пачалі капаць водаправоды.

На грунтоўны рамонт Пружан адведзена два месяцы.

— А надо жэ па-ціхонечку, — у дзядзькі на думцы трава, якую зноў трэба засеяць і паліваць, каб вырасла пад 20 верасня.

* * *

Дарога ў цэнтр горада нагадвала маршрут праз палескую дрыгву. У мястэчку ў адзін час пракладаюць водаправоды, газаправоды, электрычнасць, кладуць тратуары, садзяць кветкі і ставяць платы. Куды ні глянь — стаханаўскі ўздым. Глянеш уверх — кладуць новы дах, глянеш па баках — малююць платы, зірнеш уніз — рыюць каналы. У рамках аднаўлення на хаду рамантуюцца таксама гістарычныя будынкі.

Пад уплывам акцыі актывізаваліся местачкоўцы. У мясцовым універмагу, да якога трэба дабірацца чорным ходам, выстраілася чарга за абоямі. У жылых кварталах малявалі балконы і лавачкі.

Калі пра зайздрасць, дык у мястэчку ставяць новыя бетонныя платы, якія нагадваюць зялёна-белы вышываны ручнік. Пружаны поўнасю заслужылі на такі падарунак — у Брэсцкай вобласці ўраджай перасягнуў 90 працэнтаў.

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Куды ні глянь — работа, хадзіць даводзіцца цераз платы

Хто ў Пушчу, а хто па дровы

Сітуацыя, што склалася апошнім часам вакол Белавежскай пушчы, а дакладней той часткі, што знаходзіцца на тэрыторыі Беларусі, выклікае сур'ёзную занепакоенасць эколагаў і актывістаў прыродаахоўчага руху. У многім стан рэчаў у запаведным лесе, раздзеленым дзяржаўнай мяжой, цалкам супрацьлеглы.

Як вядома, большая частка Белавежскай пушчы прыходзіцца на беларускую тэрыторыю. Польскі нацыянальны парк „Белавежская пушча" ў некалькі разоў меншы. У той жа час асабліва ахоўваемая тэрыторыя (абсалютна-запаведная), дзе ўвогуле нічога нельга чалавеку кранаць, непараўнальна адрозніваецца. У Польшчы на яе прыходзіцца 45% усяго парку (каля 5 000 га), у Беларусі ж — 18% (каля 15 600 га). Але, канешне ж, праблема не ў тых гектарах і працэнтах, якія, тым не менш, у чымсьці адлюстроўваюць адносіны да прыроднага багацця.

Апошнія гады для беларускай часткі Белавежжа сталі сапраўдным выпрабаваннем. Як паведаміў у эксклюзіўным інтэрв'ю „Ніве" беларускі эколаг і журналіст, кіраўнік грамадскай ініцыятывы „Terra-канвенцыя" Валерый Дранчук, сённяшнія ўладары Пушчы наважаныя толькі браць ад яе і нічога не аддаваць. Па словах Дранчука, у некалькі разоў павялічылася там здабыццё драўніны, якая ідзе на продаж у замежжа. Пад выглядам санітарных высечак адбываецца знішчэнне ўнікальнасці Пушчы і яна пакрысе пераўтвараецца ў звычайны лес, страчваючы сваю першабытнасць.

Людзі ўжо прызвычаіліся ставіцца да розных заяў „зялёных" як да нейкага штучнага раздуцця праблемы. Але, зважаючы на значную колькасць зваротаў са спробамі прыцягнуць увагу да Белавежскай пушчы, прыходзіш да высновы, што пытанне ўжо набыло немалую вастрыню.

Да грамадскасці, у тым ліку і міжнароднай, звяртаюцца ўжо не толькі эколагі, але і вучоныя, журналісты і нават пісьменнікі. Як сведчыць большая частка зваротаў, больш за ўсё непакоіць людзей, узняўшых голас у абарону Пушчы — узгаданыя вышэй высечкі жывога лесу. Пераўтварэнню яе ў звычайную лесапрамысловую гаспадарку спрыяюць даведзеныя зверху планы высечак — 150 тыс. кубаметраў у год. На думку Валерыя Дранчука, на самай справе сякуць значна больш.

Але акрамя чыста экалагічных праблем, што ўзніклі перад беларускай часткай Пушчы існуе і сацыяльная. Адміністрацыйны цэнтр запаведніка знаходзіцца ў пасёлку Каменюкі, жыхары якога адчуваюць прыгнёт з боку цяперашняй адміністрацыі, што з'яўляецца структурай Упраўлення спраў беларускага прэзідэнта. Мясцовы люд здаўна жыў з Пушчы і, зразумела, ніколі не меў на мэце толькі спажыванне ейных даброт. У шэрагах працуючых у Нацыянальным парку былі менавіта яны і таму, натуральна, іх намаганнямі Пушча на працягу апошніх дзесяцігоддзяў захоўвала свой першабытны выгляд. Бо наўрад ці нармальны чалавек будзе паварварску ставіцца да таго, што называе сваім домам. Але цяперашняму кіраўніцтву, як сведчаць звароты жыхароў Каменюкоў да ўлад і грамадскасці, гэтыя людзі сталі непатрэбнымі. Пад выглядам барацьбы з п'яніцамі і гультаямі страчваюць працу кваліфікаваныя спецыялісты. За апошнія два гады такімі сталі 160 чалавек. Але ж працаваць камусьці патрэбна. І на вакантныя месцы запрашаюцца людзі з іншых рэгіёнаў краіны. Мясцовы люд у сваіх лістах да прэзідэнта Беларусі А. Лукашэнкі сцвярджае, што „цяперашняй адміністрацыі нацыянальнага парку, якая зараз цалкам складаецца з чужых для гэтай мясцовасці людзей, абыякавы праблемы пасёлка. Прыцясняючы жыхароў, адміністрацыю парку не клапоцяць цяжкасці жыцця мясцовага насельніцтва і не хвалююць пытанні, як людзям утрымліваць і развіваць асабістую падсобную гаспадарку. Нават сенакосныя надзелы, якімі працаўнікі нацыянальнага парку і пенсіянеры карысталіся многа гадоў, намаганнямі цяперашняй адміністрацыі прыведзеныя ў нягоднасць. Раней за імі глядзелі і ахоўвалі".

Напрыканцы ліпеня Белавежскую пушчу наведала адмысловая дзяржаўная камісія. Істотных вынікаў работы гэтай камісіі пакуль няма. Па словах Валерыя Дранчука, яе члены ў большасці схіляюцца да разумення існуючай перад запаведнікам небяспекі. Кіраўнік камісіі Марыя Худая абяцала дзелавое абмеркаванне праблемы ў беларускім парламенце. Але па ўсім відаць, што пытанне, як і многае ў Беларусі, закране палітыку і таму нават разуменне парламентарыямі стану спраў у Пушчы наўрад ці пераважыць стаўленне прэзідэнцкай адміністрацыі да „сваёй" гаспадаркі.

Беларускія эколагі дабіваюцца правядзення ў Белавежскай пушчы незалежнай экспертызы і разгляду пытання аб пераносе яе ў спіс Сусветнай спадчыны, якой пагражае небяспека. Калі Пушча апынецца ў гэтым спісе, то можна лічыць, што міжнародная грамадскасць прызнае варварскім стаўленне цяперашніх беларускіх улад да ўнікальнага запаведніка.

Але жыццё па-свойму вырашае праблему захавання Белавежжа. Можа не ад добрага жыцця, аднак зараз лесагаспадарчая прамысловасць на Падляшшы значна меншая чым за часамі ПНР. А заклікі і заахвочванні з боку ўлад да аблясення былых палеткаў і патрабаванні Еўрасаюза да пераводу ўсёй „польскай" Пушчы ў абсалютна-запаведную верагодна зробяць тое, што захаваецца не толькі ўнікальнасць Белавежжа, але і пашырыцца яе тэрыторыя.

Будучым пакаленням грамадзян Польшчы застанецца Белавежская пушча. А што застанецца нашчадкам цяперашніх грамадзян Беларусі — дэградаваны лес?

Уладзімір Лапцэвіч

Самаўрад па-над межамі

Як працуе польскае самакіраванне, якія ў яго кампетэнцыі і задачы, як здабывае яно сродкі на сваю працу — гэткімі пытаннямі цікавіліся ўдзельнікі 10-асабовай групы беларускіх самаўраднікаў, якая з 25 па 28 жніўня наведала Беласточчыну па запрашэнні Беларускага самаўрадавага форуму. Форум запрашае беларускіх калег у рамках праекта „Дапамога дзяржавам на шляху трансфармацыі", які фінансуецца канцылярыяй прэм'ер-міністра Польшчы. Гэтым разам беларускія самаўраднікі пазнаёміліся з працай Павятовай установы па працаўладкаванні ў Гайнаўцы, гайнаўскай аховай здароўя, Агенцтва рэструктурызацыі і мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі ды ўдзельнічалі ў сесіі Рады Гайнаўскага павета. Госці ўдзельнічалі ў дакладах на самаўрадавыя тэмы, наведалі агратурыстычныя гаспадаркі ў Нарваўскай гміне ды знаёміліся з беларускай нацыянальнай меншасцю ў Польшчы (шырэй у наступнай „Ніве"). (ма)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Прыйшоўшы на гару, многія паломнікі тры разы абыходзілі царкву

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Паломнікі з Бельска-Падляшскага неслі драўляныя крыжы і маліліся

Напярэдадні святкаванняў

Грабарка 2003

У гэтым годзе святкаванні на Святой Гары Грабарцы пачаліся раней чым у мінулых гадах ды прыцягнулі мноства праваслаўных вернікаў. Першымі прыйшлі паломнікі з Гайнаўкі. На наступны дзень далучыліся да іх пешаходныя паломніцтвы з Саколкі і Бельска-Падляшскага, а праз два дні — паломнікі з Беластока. Ужо традыцыйна прыходзяць яны перад усяночнай багаслужбай на свята Праабражэння Гасподняга, бо для вялікай колькасці вернікаў з Беластока цяжка знайсці начлег. Многія вернікі, якія штогод прыязджаюць на Святую Гару на машынах, рашыліся наведаць яе да галоўных святкаванняў. Некаторыя хацелі пазбегчы натоўпу, іншыя скарысталі вольныя ад працы суботу і нядзелю. Дзень перад галоўнымі святкаваннямі адзначалася прынясенне на Святую Гару Грабарку Іверскай іконы Божай Маці. Літургію ўзначаліў епіскап Бельскі Грыгорый.

Каб раней дайсці на Грабарку, паломнікам з Гайнаўкі і Бельска-Падляшскага трэба было моцна спяшацца. Не памяшала гэта малітвам і духоўнаму настрою. Як і ў мінулых гадах, паломнікі неслі крыжы. Некаторыя спавядаліся і прымалі прычасце ў цэрквах, каля якіх начавалі. Паломніцкія дні пачыналіся індывідуальнымі малітвамі ў хатах гаспадароў, у якіх яны начавалі. Пасля вернікі маліліся ў цэрквах. Людзі па дарозе цёпла сустракалі паломнікаў, падтрымлівалі іх. Ранцы з вопраткай ехалі на машынах. Побач іх было харчаванне і лякарствы.

— Ёсць радасць, што я дайшоў, што за дзень праходзіў па 20 кіламетраў, — заявіў гайнаўскі гімназіст. — Па дарозе мы спявалі духоўныя песні і маліліся. Затрымліваліся для малітвы не толькі каля цэркваў, але і каля капліц ды крыжоў.

Цёпла прынялі паломнікаў з Гайнаўкі і Бельска на Грабарцы, накармілі ды многім далі начлег. Каб арганізаваць адпачынак для большай колькасці паломнікаў, у час святкаванняў збіралі ахвяраванні на рамонт начлежнага дома. За сродкі сабраныя раней на тэрыторыі манастыра вяліся іншыя работы — пракладаўся асфальт навонкі агароджы ды бетанаваліся дарожкі. У драўляны кіот паставілі новую пазалочаную ікону св.св. Марфы і Марыі. Каля Іверскай іконы Божай Маці вісіць зараз больш крыжыкаў, чым было год таму.

Яшчэ напярэдадні свята Праабражэння Гасподняга многа моладзі прыбыло на Грабарку дапамагаць у арганізацыі святкаванняў. Прадавалі яны свечкі, просвіру, збіралі запіскі для малітваў, чысцілі падсвечнікі і наглядалі за парадкам. Студэнты і вучні арганізавалі стаянкі для машын і назіралі за парадкам на тэрыторыі манастыра. Дзякуючы моладзі можна было давезці да манастырскіх варот старэйшых і інвалідаў. Як і ў мінулых гадах быў вялікі выбар духоўнай літаратуры, касет з царкоўнай музыкай і фільмаў на духоўныя тэмы. Пасля багаслужбаў вернікі ішлі да крыніцы за свянцонаю вадой. Пілі яе, абмывалі хворыя месцы ды набіралі ў бутэлькі, каб завезці сямейнікам.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Амаль заўсёды за свянцонай вадой стаялі паломнікі

„Купала” зберагае культурныя каштоўнасці

Помнікі даўніны з'яўляюцца матэрыяльнымі сведкамі гісторыі народа. Багацце такой формы нашай памяці — невялікае. Шмат помнікаў, напрыклад, памятак умоў жыцця нашых продкаў, мы самі знішчылі і знішчаем, несвядома выкідаючы тое, што стала нам непатрэбным, што замянілі нечым іншым.

У захаванне помнікаў нашай беларускай даўніны ангажуецца Зіновій Галёнка. У яго агратурыстычнай гаспадарцы „Купала” ў Арэшкаве-Парыеве можна ад нядаўна, апрача звярыны і хатняй жывёлы, якой штораз менш і менш на нашых вёсках, паглядзець шмат даўніх сельскагаспадарчых прылад і хатняе аснашчэнне.

Некалькі месяцаў раней „Ніва” друкавала аб'яву, у якой спадар Галёнка звяртаўся да чытачоў уступіць яму старыя рэчы. Спытаў я яго, ці быў водгук на тую аб'яву.

— Не, ніякага водгуку не было. Затое першым падарункам, які мы атрымалі для нашай выстаўкі, быў стары конны плуг з фірмы, якая займаецца збытам і сервісам аўтамабільных шын з Дэмбіцы. Апрача яго маем драўняную і жалезную бораны, пружыноўку. Іншыя прылады абяцалі даць суседзі, сваякі. Паволі ўсё збіраецца. Збіраць гэта на ўра — раз'язджаць і купляць — каштавала б дорага. Ужо за год гэтыя экспанаты будуць адноўлены і будзе іх, веру, намнога больш.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Міхал Мінцэвіч

На Грабарку даўней і сёння

На Спаса многія праваслаўныя вернікі паломнічаюць на Святую Гару Грабарку. У шасцідзесятыя гады (і яшчэ раней), калі Чаромха была мітуслівым цэнтрам ды знаходзілася на скрыжаванні чыгуначных шляхоў, у ёй збіралася шмат падарожных-паломнікаў. На два дні да свята чыгуначная служба дадавала дадатковыя вагоны, выцягваючы цягнікі ўдвая, але і гэтага было замала.

Прыгадалася мне адно здарэнне з маладосці. Сабраўся быў і я на Святую Гару Грабарку з сябрамі. Паколькі надвор'е было халоднае — выязджалі мы нанач — дык узяў я з сабою паплінавы плашч. У вагоны не пагрузіўся, бо і так былі яны перапоўнены. На паравозе памочнікам машыніста ехаў мой школьны сябрук Алесь Рэпка. Запрасіў ён мяне да сябе. Мне і ў думках не мільганула, якія могуць быць паслядоўнасці. Калі я захапляўся краявідам, Алесь дакідаў у печку вугаль. Пыл ад яго асядаў на маю вопратку і твар. У Сычах выйшаў я на перон не ў паплінавым плашчы, а быццам у „камінарскім” касцюме. Твар быў зацухмолены сажай. Пайшоў я над ручаёк памыцца. Плашч у сумку паклаў і ўжо не апранаў яго. У хаце адразу матулі для сціркі аддаў. Дамоў таксама з прыгодамі дабіраўся. У касцюме ўсе гузікі мне паабрывалі, пакуль я ўскараскаўся ў вагон. Так закончылася маё першае паломніцтва. Яшчэ раз паехаў я на Грабарку ў сямідзесятыя гады. Маладых тады больш цікавілі купцы з марожаным ды цацкамі чым багаслужба ў царкве. Прыгадваю сабе „бочку смерці”, калі смяльчак на матацыкле на верх запускаўся. Казалі пазней, што каскадзёр забіўся. Многія прахожыя запрашалі ў карты пагуляць. Абяцалі высокія выйгрышы. Пачаткова так яно і было, але пазней чалавек заставаўся ў дурнях. Бывала што і апошні грош ад чалавека выманілі.

Зараз многае перамянілася. Большасць паломнікаў на Грабарку адпраўляецца на аўтамабілях. Паколькі здароўе мяне падводзіць, дык цяпер усяго выязджаю на станцыю, каб паназіраць за паломнікамі і з сябрамі пагаварыць. Сёлета на цягнік у Седльцы адправілася больш за восемдзесят пасажыраў. Усе ў чатырох вагонах памясціліся. З Бельска нямнога прыехала. Большасць падарожнічала з Гайнаўкі. Надвор'е спрыяла для паломніцтва.

Уладзімір Сідарук

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Канстанцін Курыга ля студні выкапанай ягоным бацькам Аляксеем у 1930 г.

Даўней студні капалі

Яшчэ нядаўна студні былі пастаянным элементам рынка кожнага горада і мястэчка. Калі настала эпоха водаправодаў, студні сталі знікаць нават з вясковага краявіду. У нябыт адыходзіць занятак капальнікаў студняў.

— Пасля першай сусветнай вайны попыт на паслугі капальнікаў у вёсках і мястэчках быў вялікі. Асабліва яўрэі хацелі мець уласную крыніцу пітнай вады, — успамінае Канстанцін Курыга з Крывой Бельскай гміны. — Мой бацька, Аляксей, капаў студні ўвесь міжваенны перыяд. У 1920-х гадах уласнаручна зрабіў з елкі драўляную форму для вырабу цэментавых труб, якой можна карыстацца яшчэ і сёння. Стальныя элементы для формы зрабіў каваль, арлянскі яўрэй Элько. Бацька першую студню выкапаў у 1930 годзе на сваім панадворку і да гэтай пары яна служыць нам. Уся ваколіца карысталася трубамі бацькавай вытворчасці і яго капальніцкімі паслугамі.

Студні капалі ад вясны да зімы. Аляксей Курыга на працу хадзіў пехатою і вяртаўся дадому пасля таго, калі студня была гатова. Пасля вайны яго сын Канстанцін таксама стаў капальнікам.

— Калісьці пакуль пачаць капаць студню, трэба было падабраць адпаведнае месца, каб добра трапіць на падземныя воды, — расказвае Канстанцін Курыга. — Для таго капальнікі карысталіся паслугамі экстрасенсаў або самі вызначалі месца пад студню. Капальнік басанож з разгалінаванай веткай бэзу ў выцягнутых руках хадзіў па панадворку ў пошуках вадзяной жылы. Часам за парадай звярталіся да шаптухі.

Капальнік працаваў з памочнікам. Павінен гэта быць спрытны, лоўкі чалавек, а не разява. Выцягнуць вядро пяску, калі ўнізе працуе чалавек, гэта вельмі адказная справа. У час капання студні трэба было ўважліва сачыць за вертыкальнасцю труб, якія ўпускалі ўглыб зямлі. Пры восьмай трубе і ніжэй змяняўся ціск, здавалася, быццам там менш паветра, а капальнік адчуваў большую стомленасць.

Са знаходкай вады бывала па-рознаму. Здаралася, што пасля прабіцця гліністага грунту вада пачынала раптоўна біць струяй і капальнік уцякаючы на драбіну няраз губляў боты. Небяспечна было, калі капальнік натыкаўся на г.зв. мулік. Тады трубы так хутка пагружаліся ў грунт, што капальнік не паспяваў выбіраць зямлю. Трубы маглі разысціся на бакі, а студня — заваліцца. Аднак здаралася і так, што да вады нельга было дабрацца. Нават не памагала прабіванне ўглыб жалезнай трубы. Тады капальнік злаваўся. Некаторыя маліліся ўнутры студні, іншыя — лаяліся.

Калі работа ішла паспяхова, студню з дзесяці труб можна было выкапаць за два дні. Такія студні выступаюць на тэрыторыі Орлі, Бельска ці Браньска. А ў Кляшчэлеўскай, Нурэцкай ці Гарадоцкай гмінах студні надта глыбокія — аж пад 30 труб. Выкапаць такую шахту мог толькі спрактыкаваны спецыяліст.

Пры санацыі ў яўрэяў студні мелі калаўроты, а ў хрысціян — жураўлі. Да таго, як людзі пазналі цэмент, студня ўнутры выкладалася камянямі, а пазней дубовым дрэвам. Яшчэ і сёння можна сустрэць дубовыя студні. У Спічках, Арлянскай гміны 150-гадовай студняй, абкладзенай па баках і на дне дубінай, да сённяшняга дня карыстаецца пенсіянер Міхал Бабулевіч.

У народзе гавораць, што сапраўдны мужчына павінен даць жыццё сыну, паставіць дом, пасадзіць дрэва і выкапаць студню. Аказваецца, апошняя ўмеласць лішняя. Цяпер дастаткова адкруціць кран.

Міхал Мінцэвіч

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Драўляная форма для труб (1920-я гады)

Вачыма паляка

Нявыгадныя гадавіны

Шасцідзесятая гадавіна выбуху паўстання ў беластоцкім гета прыгадала мне аб святкаваннях таго чыну, у якіх я ўдзельнічаў у апошнія дзесяць гадоў. Амаль год у год 16 жніўня адбываўся нейкі скрыгіт — больш або менш па віне гарадскіх ці парадкавых улад. Толькі пры прэзідэнцтве Леха Казлоўскага, а, папраўдзе, ліберальнай управе горада, польска-яўрэйскія адносіны здаваліся карэктнымі. Паявіўся нават шанц, што некаторыя польскія яўрэі з Ізраіля і ЗША пацікавяцца інвестыцыямі ў сталіцы нашага рэгіёна. Улады Беластока ў той час намагаліся наладзіць бліжэйшыя кантакты не толькі з выпадку чарговых святкаванняў гадавіны паўстання ў гета. Вось, хоць бы беластоцкія чыноўнікі наведвалі жыхароў кірыята Беласток у Ізраілі. Пасля было ўжо толькі горш. З часу, калі ўлада перайшла ў рукі правых — Анджэя Люсы, Кшыштафа Юргеля і, ўрэшце, Рышарда Тура — 16 жніўня пад помнікамі па вул. Жабяй і Суражскай яўрэі маглі пабачыць на акаляючых сценах свастыкі, хтосьці не падумаў і не павесіў побач беластоцкага сцяга ізраільскага, банк вакол помніка па Суражскай пабудаваў стаянку (што цікава — заўзятар правых Лех Руткоўскі быў тады яго старшынёю). Урэшце, сёлета, калі па Жабяй гаварылі кадыш, малітву за памерлых, і, здавалася, што афіцыйная частка ўрачыстасці праходзіць карэктна (хай сабе і ў напрузе), у атачэнні кардона паліцыі, хтосьці каля помніка стаў выбіваць дываны. Зразумела, як тут абвінавачваць гарадскія ўлады! Аднак напруга ў пазбяганні далікатнай яўрэйскай тэмы — для беластоцкіх улад вельмі нявыгадная. Мае рацыю Тамаш Віснеўскі, выдатны знаўца яўрэйскага пытання ды гісторыі Беластока і ўсяго падляшскага рэгіёна, які да шасцідзесятай гадавіны паўстання напісаў у адной з мясцовых газет: „Тым часам беластоцкія ўлады выразна баяцца гэтай далікатнай тэмы. Адчуваюць сябе нязручна; баяцца праявіць ініцыятыву. Хочуць ускласці вянец і як найхутчэй вярнуцца ў свае кабінеты. Ад гадоў адны і тыя ж здымкі ў гарадскіх галерэях ды чарговыя, выключна мартыралагічныя, сесіі — гэта перабіранне нагамі ў месцы, неразуменне неабходнасці прамоцыі станоўчага вобліку горада".

Фактычна, цяжка ўявіць, каб дырэктары школ хацелі наставіць супраць сябе права-каталіцкіх гарадскіх правадыроў ды выступіць, прыкладова, з ініцыятывай арганізацыі вандроўнага лагера моладзі з Беластока і з нейкага ізраільскага горада — да таго, не па слядах мартыралогіі. Цяжка нават і думаць аб гэткіх мерапрыемствах, калі ідэю гісторыка Адама Дабронскага, які хацеў павесіць на гарадской ратушы (да вайны жыдоўскім гандлёвым цэнтры) табліцу, што прыгадвала б пра даваенны яўрэйскі Беласток нават і не выслухаў ні папярэдні, ні сённяшні прэзідэнт Беластока.

У мяне ўражанне, што ў шмат якіх пытаннях беластоцкая ўправа кіруецца выключна прынцыпамі непахіснай абароны каталіцтва і польскасці на гэтай, „пад пагрозай" меншасцей, тэрыторыі — таксама і тых меншасцей, прадстаўнікоў якіх амаль і няма ў сучасным Беластоку. Датычыць гэта ўсёй палітыкі ў дачыненні да няпольскіх і некаталіцкіх меншасцей. Думаю, аднак, што з будучага года, пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз, кіраўнікі Беластока ды ўсе, хто ў час узнёслых хвілін выбіваюць дываны, неяк з гэтай праблемай павінны справіцца. У Еўрасаюзе няма месца на нацыянальную, рэлігійную ці этнічную варажнечу, нават калі і прытварацца, быццам усё карэктна.

Мацей Халадоўскі

Дзень фактычнай незалежнасці

[1 ☞ працяг]

тыкуле гаварылася, што кожная дзейнасць супраць нацыянальнай дзяржаўнасці БССР з боку партыі, грамадскіх арганізацый, ці прыватных асоб будзе ўспрымацца як злачынства. Згодна зместу гэтай дэкларацыі дзейнасць сучаснага прэзідэнта і яго супрацоўнікаў павінен у будучыні разглядаць суд незалежнай Беларусі.

27 ліпеня з 1992 г. стала дзяржаўным святам Беларусі. Некаторыя апазіцыянеры тадышняга кіраўніцтва краіны пратэставалі супраць такога падыходу да даты-сімвалу. Дамагаліся яны ўшанавання 25 Сакавіка. Улічваючы факт палітычнай і гістарычнай свядомасці тагачаснага грамадства Беларусі, дата 27 ліпеня больш за 25 сакавіка адпавядала яго псіхалагічным патрэбам. 27 ліпеня было сімвалам перамогі ідэі палітычнай і культурнай аўтаноміі. Дэкларацыя аб суверэнітэце замацоўвала стан, якога дамагаліся ўдзельнікі I Усебеларускага з'езду ў снежні 1917 г., разагнанага бальшавікамі. Пасля 27 ліпеня 1990 г. надалей існавала БССР як частка Савецкага Саюза, а найвышэйшы палітычны цэнтр фармальна знаходзіўся не ў Мінску, а ў Маскве, на палітычнай карце Еўропы і свету не існавала дзяржава з назвай Беларусь.

25 жніўня Вярхоўны Савет БССР вырашыў парваць усе сувязі з фактычна неіснуючым ужо Савецкім Саюзам, памяняў назву краіны на Рэспубліку Беларусь, забараніў рэспубліканскаму ўраду прымаць якія-небудзь загады з Масквы, спыніў дзейнасць Камуністычнай партыі Беларусі, а прэм'ер-міністр Вячаслаў Кебіч дэманстратыўна выступіў з партыі. Некалькі дзён пазней гэты ж Вярхоўны Савет прыняў пастанову аб вяртанні нацыянальных сімвалаў — герба Пагоні і бел-чырвона-белага сцяга. На працягу некалькіх дзён паўсотні краін у свеце прызналі незалежную Беларусь. Гэта былі рэвалюцыйныя змены ў гісторыі Беларусі, значэння якіх ні тады, ні цяпер ніхто да канца не ўсведамляе. Несумненна дата 25 жніўня ў беларускіх календарах павінна значыцца чырвонымі літарамі, як і, дарэчы, 25 сакавіка.

Канструкцыя дзяржавы ўзведзенай пасля 25 жніўня 1991 г., відаць, не была дрэннай, калі да канца не змаглі яе знішчыць Лукашэнка і падобныя яму, трымаючы ўжо дзевяты год абсалютную ўладу. Зразумела, дзяржава гэтая існуе галоўным чынам дзякуючы паслабленню расійскага імперыялізму. Калі б на Крамлі сядзеў цяпер Пётр Вялікі, Мікалай I, Ленін, ці Брэжнеў, несумненна, кожны з іх выкарыстаў бы з'яву Лукашэнкі і даўно зрабіў бы яго губернатарам Камчаткі, а Беларусь — „северно-западным краем". Лёс спрыяе Беларусі, а дата 25 жніўня сапраўды аказалася шчаслівай.

Яўген Мірановіч

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Малодшыя птушкі трэба будзе раздзяліць, каб не пабіліся

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Стары драўляны дом і вароты з дашком напамінаюць аб мінулым

Скансэн са страусамі

Штораз больш экскурсій і індывідуальных турыстаў прыязджае да Сцяпана Чабая ў Новае Беразова. Цікавяцца яны страусамі і рэгіянальным скансэнам, які ўзнікае на яго панадворках.

У сонечны дзень спатыкаю Сцяпана непадалёк хаты. Разам з сынам Веславам і старэйшым памочнікам рыхтуюцца яны да выканання чарговай агароджы для страусаў. Зараз у Сцяпана 13 птушак — павінен ён разгарадзіць вялікія тэрыторыі для паасобных сем'яў.

— Спачатку я па кніжках вучыўся гадаваць страусаў. Загінула тады адна птушка, бо позна раздзяліў самцоў. Зараз рыхтую асобныя памяшканні, у якія буду пасяляць раздзеленыя страусавыя сем'і, — Сцяпан Чабай паказвае на перабудаваны са старога хлява будынак. Непадалёк яго бегаюць 4 вялікія страусы, а далей — 9 меншых. Гадоўлю страусаў распачаў Сцяпан у 2002 годзе. Намерваецца павялічыць статак да 50 штук. Цэлымі днямі даглядае птушак і працуе ў скансэне.

Сцяпан Чабай нарадзіўся і выхаваўся ў Беразове, але пасля пераехаў на пастаяннае жыхарства ў Гайнаўку. У 2000 годзе рашыўся вярнуцца ў родную вёску. Купіў самы стары ў вёсцы дом (1863 года будовы) і стаў рамантаваць яго для музейных патрэб. Пасля дакупіў суседні дом з канца XIX стагоддзя і стаў прыстасоўваць для прыёму турыстаў. На вялікіх панадворках рашыўся гадаваць страусаў. Стаў купляць і браць у арэнду сельскагаспадарчую зямлю, каб вырошчваць свой корм для птушак. На адным участку пасадзіў вішні. Зараз разбудоўвае сваю агратурыстычную гаспадарку.

— Я задаволены сельскагаспадарчай работай. Калі працую на панадворку, вельмі хутка мінае дзень. Пры нагодзе будовы скансэна сустракаюся з цікавымі людзьмі. Часта прыязджаюць індывідуальныя турысты або арганізаваныя групы. У канцы навучальнага года амаль штодзень прыязджалі вучні. Ёсць магчымасць захаваць частку старой культуры і гэта цешыць, — заяўляе Сцяпан Чабай.

Апошнім часам на панадворку многа памянялася. Сцяпан рашыўся пакрыць старыя дамы саломай. На сваім полі пасеяў жыта, а пасля змалаціў яго ў старой малацілцы. З дапамогай спецыялістаў на хатах з'явіліся стрэхі. Будынкі сталі намнога прыгажэйшымі і больш напамінаюць XIX-вечныя збудаванні.

— Толькі даўней акон не было ад вуліцы. У старых дамах у Новым Беразове была вялікая ізба і сені. Каб лепш абагрэць жыллёвы будынак, ад вуліцы і загараддзя былі да яго прыбудаваныя хлявы. У маёй найстарэйшай хаце таксама так было, а пасля хлеў быў ліквідаваны, — тлумачыць Сцяпан.

У абодвух яго дамах знаходзяцца гліняныя печкі. У памяшканнях, прыстасаваных да музейнай дзейнасці, знаходзяцца даўнія прылады працы, гліняныя гаршкі і міскі, драўляныя лыжкі, калыска і вышыўка на старой пасцелі. Побач саламяных вырабаў стаяць кошыкі з ракіты. Рамантуюцца яшчэ памяшканні, у якіх будуць жыць турысты. Будзе вернуты даўні выгляд памяшканняў і схаваная сучасная тэхніка. Турыст, які захоча спаць на старым драўляным ложку, будзе мог адначасна пакарыстацца тэлевізарам, які будзе схаваны ў старадаўняй шафе. У асобным пакойчыку будуць схаваны туалеты. Будзе таксама магчымасць памыцца ў рускай лазні.

Турыстам будзе дадзена магчымасць пазнаёміцца з даўнімі сельскагаспадарчымі прыладамі. Зараз побач драўлянага будынка знаходзяцца бораны. А будуць яшчэ саха, сярпы і косы. Плот з тонкага галля ўпрыгожвае старую забудову.

— Ці гадоўля страусаў будзе прыбытковай, акажацца пасля ўступлення Польшчы ў Еўрасаюз. Калі ў Падляшскім ваяводстве будзе бойня страусаў, можна будзе гадаваць іх на мяса. У іншым выпадку трэба будзе ставіць на продаж яек. Зараз каштуюць яны ад 50 да 100 злотых. Калі ёсць магчымасць прадаць рэстаранам, можна разлічваць на большы прыбытак, — інфармуе Сцяпан і прыносіць у хату звышкілаграмнае яйка. — Каб стварыць сапраўдную сельскую атмасферу, трэба купіць мне асла, некалькі коз і авечак.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Найстарэйшыя страусы — любімцы Сцяпана

Змены ў законах аб чужаземцах

Новыя законы аб чужаземцах і іх абароне на тэрыторыі Польшчы ўступяць у сілу 1 верасня. Прадбачваюць яны шэраг новых мер.

Адно з найважнейшых вырашэнняў датычыць прадаўжэння візы часовага побыту. Прадаўжэнне стане магчымым толькі тады, калі чужаземец задаволіць наступныя ўмовы:

— за прадаўжэнне візы прамаўляе важны прафесійны ці асабісты інтарэс або гуманітарныя фактары;

— падзеі, якія спрычынілі хадайніцтва за прадаўжэнне візы выступілі незалежна ад волі чужаземца ды нельга было іх прадбачыць у момант выдачы візы;

— акалічнасці не прадказваюць, што мэта побыту чужаземца ў Польшчы разыдзецца з яе дэкларацыяй;

— няма іншых акалічнасцей, якія выявілі б, што даныя чужаземца ў спіску непажаданых на тэрыторыі Рэчы Паспалітай асоб, няма ў яго сродкаў на побыт у Польшчы, і г.п.

Чужаземцы, якія звернуцца да ваяводы з просьбай аб выдачы чарговай візы да 1 верасня, змогуць яе атрымаць у выпадку выпаўнення ўмоў, а ўсім тым, хто з 1 верасня будуць прабываць у Польшчы на падставе візы, трэба будзе выехаць да сканчэння яе тэрміну і, калі трэба, выступіць за яе выдачу ў консула за мяжой.

У выпадку дазволаў на часовае пражыванне ў Польшчы, перш за ўсё адбудзецца лібералізацыя прынцыпаў, якія датычаць чужаземцаў, што пажаніліся з грамадзянамі Польшчы. Дазвол на часовае пражыванне будзе выдавацца чужаземцам, якія атрымалі абятніцу (або яе працяг) дазволу на працу ці пісьмовую заяву працадаўцы аб намеры даручэння чужаземцу працы і тым чужаземцам, у якіх неабходныя для жыцця ў Польшчы сродкі. Дазвол атрымаюць таксама тыя чужаземцы, якія займаюцца карыснай для нацыянальнай гаспадаркі РП дзейнасцю, а ў прыватнасці — як гэта сцвярджаецца ў законе — спрычыняюцца росту інвестыцый, трансферу тэхналогій, увядзенню карысных навінак ці стварэнню новых месц працы, ды асобы з прызнанымі мастацкімі здабыткамі, якія намерваюцца ў Польшчы працягваць сваю творчасць, прымаючы ўдзел у абучэннях і прафесійных стажыроўках, якія будуць ажыццяўляцца ў рамках еўрасаюзных праектаў, намерваюцца як члены сям'і пражываць з мігруючай асобай, знаходзяцца ў сужонстве з польскім грамадзянінам, і студэнтам-чужаземцам, калі дакажуць, што не трэба ім карыстацца сацыяльнай апекай. Такія дазволы будуць выдавацца на перыяды да 2 гадоў.

Згода на г.зв. талераванае прабыванне будзе выдавацца чужаземцу, якога нельга выдаліць з Польшчы, калі:

— у сваёй краіне пад пагрозай можа апынуцца права асобы на жыццё, свабоду і асабістую бяспеку,

— асоба можа падвяргацца катаванням, нялюдскім адносінам ці прыніжэнню, прымусу да працы, пазбаўленню права на добрасумленны судовы разбор ці пакаранню без юрыдычнай асновы ў канвенцыі аб Абароне правоў чалавека і падставовых свабод (Рым, 1950).

Што цікава, заканадаўца ўводзіць магчымасць легалізацыі побыту чужаземцам, якія нелегальна і бесперапынна прабываюць у Польшчы з 1 студзеня 1997 г. Гэта пры ўмове, што чужаземец укажа месца жыхарства, дакажа абятніцу дазволу на працу ды дакажа свой прыбытак або маёмасць, якіх дастаткова для ўтрымання і лячэння сябе і сям'і, якая на яго ўтрыманні, не карыстаючыся сацыяльнай апекай прынамсі праз год.

Новая таксама магчымасць выдачы чужаземцу польскага дакумента тоеснасці, які будзе пацвярджаць іх персанальныя даныя ў час прабывання на тэрыторыі Польшчы, але не польскае грамадзянства. Змогуць яго атрымаць народжаныя ў Польшчы непаўналетнія чужаземцы, якія прабываюць тут без бацькоў ды ў якіх няма дакументаў падарожжа, а таксама — у асабліва абгрунтаваных выпадках — тыя, у каго няма ніякага грамадзянства. Такі дакумент не дасць права на перасяканне мяжы.

Дакладную інфармацыю пра новыя законы аб чужаземцах можна знайсці на Інтэрнэт-старонцы Падляшскай ваяводскай управы. (холм)

Зорка

старонка для дзяцей

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Плаванне на водавеласіпедзе

Летні адпачынак у арэшкаўскай школе

Вучні Пачатковай школы ў Арэшкаве пачалі канікулы з тыднёвага адпачынку ў школе, які працягваўся з 23 да 27 чэрвеня. Заняткі з 10 да 13 гадзіны праходзілі ў школьным будынку (настольны тэніс, камп'ютэр, бібліятэка), на спортпляцоўцы (гульні з мячом) і ў наваколлі (экскурсіі). Дзеці мелі харчаванне і сувеніры. Кожны дзень прыходзіла па 8-12 асоб, але найбольш — 22 дзетак — з'явілася ў пятніцу, 27 чэрвеня, бо на той дзень была запланавана экскурсія на вадаём Бахматы каля Дубіч-Царкоўных.

На ваду паехалі школьным „гімбусам" разам з дырэктаркай Гражынай Бэрэзняк і настаўніцай Лідзіяй Панькоўскай. Пабыўка пачалася збіраннем хворасту для вогнішча, пасля пяклі каўбаскі і папівалі напоі. Потым былі гульні і спевы пры вогнішчы ды футбольныя спаборніцтвы. Аднак дзяцей найбольш рупелі забавы ў вадзе і плаванне на вадзяным веласіпедзе, бо такім заняткам спрыяла сонечнае надвор'е. Адбыўся яшчэ конкурс будавання пясочных замкаў. На канец дырэктар школы ўручыла пераможцам узнагароды, а іншым удзельнікам сувеніры. Зараз пасля поўдня дзеці вярнуліся ў школу.

Спонсарамі летняга адпачынку дзяцей былі гайнаўскі ПСС, „Варта" і дырэктар школы Гражына Бэрэзняк, якая задумала мерапрыемства і на працягу ўсіх дзён разам з іншымі апекунамі наглядала за адпачынкам і беражна дбала пра дзяцей. Гэтая ініцыятыва арэшкаўскіх настаўніц можа быць узорам іншым школам.

Міхал Мінцэвіч

Мікола Бусько

Вясёлая прыгода

Шумна тут у агародзе,
Хоць усе жывуць у згодзе.

Бульба кажа:
— Наш Гарох
Спаць пад яблыняй не лёг,
Не паверыце ніколі —
Зноў паплёўся да Фасолі.
Кмен смяецца:
— Ох! Ох! Ох!
Лезе сватацца Гарох!
А чырвоненькі Бурак,
Гэты сціплы халасцяк,
Цалаваўся адвячоркам
З прыгажуняй нашай —
Морквай.
— Горка! —
Перац закрычаў,
Аж прачнуўся Малачай.
У сукеначцы
Да пятаў
Захіхікала Салата.
— Вось дык штучкі! —
Рагаталі
Рэдзька з Бручкай.
Тут Гарбуз азваўся злосна:
— Мне і так на сонцы млосна!
Развялі тут тары-бары.
Будзе дождж,
Вунь ходзяць хмары...

Бачаць, дождж на падыходзе,
Ціха стала ў агародзе.

Ніна Мацяш

Вярблюдкі

Па пагалосках мы, вярблюдкі,
Страшэнна брыдкія няўклюдкі.

Што ж, непрывабныя, затое
Ваюем пераможна з тлёю.

Нязграбныя, але не хлусім:
Сігае прэч ад нас і вусень.

У лесе шкоднікаў багата,
Паўсюль знішчаем іх зацята.

Зімовы бор і гай вясновы
Нам шчыра дзячаць за ахову.

Мяркуй, ці ісцівыя чуткі,
Што непрыгожыя вярблюдкі.

Гарывада

Даўным-даўно людзі жылі як хацелі і не ведалі прымусу. У радасці і шчасці жылося ім. Любілі і шанавалі родную зямельку, і яна за любоў і шанаванне давала ім усяго ўдосталь: палеткі адплачвалі шчодрай збажыной, лясы — грыбамі-ягадамі, незлічонай дзічынай, а рэкі і азёры аж кішэлі рыбаю. І быў яшчэ на гэтай зямлі цуд — чароўная рэчка. Шырокая і паўнаводная, яна была незвычайнай тым, што ў ёй гарэла вада. Далёка па ўсім свеце ішла слава пра гэты цуд. Пачуў пра дзіва злосны пан з чорнымі і гідкімі, як у таракана, вусамі, з даўжэзнымі заграбастымі рукамі. Наехаў той пан-таракан на край з наймітамі, прымусіў людзей працаваць на сябе, а плаціў так мала, што яны ледзь не паміралі з голаду. Сілы, каб змагацца з прыхаднямі, не было ніякай. Панастаўляў пан наглядчыкаў з гумовымі таўкачамі, і калі хто асмельваўся сказаць хоць слова супраць яго, білі яны таго гумовымі таўкачамі і цягнулі ў вязніцу. Цяжка, невыносна стала людзям... Салёны пот выядаў вочы, а паскардзіцца ці проста заспяваць родную песню ніхто не меў права, бо і за гэта білі наглядчыкі. Зняверыліся людзі, думалі, што век ім векаваць у нядолі. І ім, і дзецям іхнім, і ўнукам.

Ды з'явіўся аднойчы ў тым краі чараўнік. Узмахнуў ён чароўным кіёчкам, і адразу заўсміхаліся людзі, разнялі сцятыя вусны, загаварылі, бо ўжо нават мову сваю забыліся, толькі мычэлі, як нямыя, і паказвалі адно аднаму на мігах. Загаварылі — і радасць запанавала між імі. Боль і гора зніклі, а разам з імі і злосны вусаты пан-таракан некуды падзеўся. Здавалася, жыві цяпер ды радуйся. Але перасталі біць крыніцы чароўнай рэчкі, абмялела яна і зусім высахла. Забедавалі людзі, а чараўнік і кажа:

— Не наракайце на долю, не бядуйце. Каб быць шчаслівымі, трэба самім парупіцца. Не сядзіце склаўшы рукі, а шукайце самі гаручую ваду. Знойдзеце — яна і вам, і вашым дзецям і ўнукам шчасце прынясе.

Сказаў так і знік, толькі ўслед за ім лісце зашамацела, і елкі з хваінкамі ў той бок вершалінамі загайдаліся.

Сабраліся людзі, пачалі раіцца, як быць, каб зноў забілі магутныя крыніцы з гаручай вадой, каб зноў напоўнілася рэчка, заззяла дзеля гонару і славы краю...

Знайшліся сярод простых людзей людзі вучоныя, якія шмат кніжак прачыталі і ўсё ведалі.

— Трэба свідраваць зямлю, устаўляць у свідравіны жалезныя трубы. Толькі так шукаюць гаручую ваду,— сказалі яны.

Паслухаліся людзі, сталі рабіць, як вучылі вучоныя. І каля Нарачы свідравалі, і каля Мядзела, і аж пад Полацкам. І нідзе не маглі да гаручай вады дакапацца. Пайшлі тады людзі далёка-далёка, на Палессе. І раптам аж пад Рэчыцай напаткалі маленькага чалавечка, не большага за далонь.

— Куды ж вы, мае людцы, выбраліся, што ўсе ногі аб карэнні-камяні пазбівалі, учарнелі ад сонца, ад ветру? — спытаўся ён.

Селі людзі ў цянёчак і расказалі пра свой клопат.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Аня Аляксейчук з бацькамі ў першым радзе

Анечка

Адной з наймалодшых паломніц у час пілігрымкі да Іконы Супрасльскай Божай Маці была Аня Аляксейчук з Беластока. Дзяўчынка ўжо другі раз паломнічала ў Супрасль. Два гады раней бацькі везлі яе на калясцы. А зараз — Аня, як той матылёк, усю дарогу перайшла самастойна!

Дзяўчынка — вучаніца польска-беларускага садка ў Беластоку. З верасня Аня пойдзе ў „старшакі".

Па дарозе ў Супрасль высветлілася, што ўся сям'я Ані — верныя чытачы „Зоркі". Дзяўчынка сама завяла з намі знаёмства. Яна распазнала нас па беларускіх кашулях і мове.

У Супраслі Аня сустрэла дзядулю і яны разам хадзілі за ручку.

ЗОРКА

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Габрыся Цыванюк — Прадшколле н-р 22 у Беластоку

Габрыся

Габрыся Цыванюк — дэкламатарка, спявачка ды самая наймалодшая ўдзельніца беларускіх конкурсаў. Дзяўчынка — вучаніца Самаўрадавага прадшколля н-р 22 у Беластоку. Габрыся заўсёды заваёўвае прэстыжныя месцы. Першым і самым верным паклоннікам яе выступленняў з'яўляецца тата. Разам з дачушкай ён удзельнічае ў кожным мерапрыемстве.

На здымку Габрыся ў час раённых элімінацый конкурсу „Беларуская песня". На гармоніку іграе Мікола Мяжэнны.

ЗОРКА

Два браты і чорт

(Беларуская народная казка)

Жылі калісьці два браты. Адзін брат быў бедны, а другі багаты. Абодва мелі жонак, але багаты не меў дзяцей. У беднага было шмат дзяцей, жыў ён заўсёды ў недастатках. І пачаў ён ад гора піць ды сваю жонку біць. Спаткаліся аднойчы браты ў горадзе. Бедны багатаму і кажа:

— Пойдзем, брат, з гора вып'ем.

І пайшлі яны ў кабак. Напіліся як мага быць і ідуць дахаты ноччу. Даходзяць да маста, што ляжаў цераз рэчку. Чуюць браты: хтосьці ў вадзе плёскаецца. Селі браты і слухаюць. Багаты кажа:

— Гэта, мусіць, чые-та качкі, давай іх зловім.

А бедны адказвае:

— Гэтым, брат, не разбагацееш.

Але прыслухаўшыся лепш, яны пачулі чалавечы голас.

Адзін чорт выскачыў на бераг і кажа другому:

— Хадзі і ты, будзем тут сядзець.

А той, што яшчэ мыецца, адказвае:

— Я седзячы ў трубе ўжо загарэў, дык трэба хоць трохі памыцца.

А той на беразе адказвае:

— А я як толькі прыйду, так мужык з жонкай і давай біцца, і давай біцца. Я тады ажно ад радасці скачу.

Бедны брат вельмі дрэнна жыў з жонкай, заўсёды прыходзіў п'яны. Калі яна чуць не пачуе, як ён стукане ў дзверы, то ўжо ўваходзіць мужык і давай з ёй біцца.

Пачуў гэта бедны брат і думае: „Гэта, мусіць, пра мяне так гаворыць, я вельмі дрэнна жыву з жонкай".

Прыгледзеўшыся, бедны брат заўважыў, што адзін чорт узяў бутэлечку, памазаў сабе вочы. Тады бедны брат падкраўся, узяў гэту бутэлечку і памазаў сабе адно вока. Цяпер ён убачыў двух чартоў. Яны мыліся, скакалі і ўсё размаўлялі. Той чорт, які хадзіў да багатага брата, усё сумаваў і прасіў парады ў старэйшага чорта. Старэйшы быў вельмі рады.

Падслухаў гэта бедны брат і думае: „Цяпер хай як чорт ні скача, але і я ўжо лаяцца і біцца з жонкай не буду".

Пабеглі чарты хто куды. Перайшлі браты рэчку і пайшлі кожны дахаты.

Прыходзіць бедны брат, пастукаў, а жонка ўжо слухае, калі ён будзе ісці, каб хутчэй адкрыць яму. Пабегла яна, адкрыла. Уваходзіць мужык п'яны, але не лаецца. Праходзіць, сядае на лаву.

— Ну, жонка, давай-ка мне есці.

Жонка ад радасці не ведае, як яму падаваць. Наліла ў міску супу і нясе, а чорт ей пад ногі, яна павалілася і разліла суп. Вельмі спужалася, што мужык будзе біцца. А мужык намазаў вока, дык бачыць гэтага чорта.

Мужык кажа:

— Ідзі, жонка, спаць лажыся, я сам вазьму есці.

Узяў мужык саган, паставіў на стол, пад'еў і ідзе спаць. Але бачыць, як чорт круціцца пад нагамі. Мужык і кажа:

— Не круціся, бачу я цябе, і цяпер ужо ты са мной нічога не зробіш.

А чорт пытае;

— Каго ты бачыш?

А мужык кажа:

— Чорта.

Чорт:

— А якім вокам ты бачыш?

Мужык адказвае:

— Правым.

Чорт як даў па воку, так і выскачыла вока. І так астаўся бедны брат без вока. З жонкай стаў жыць добра, кінуў піць гарэлку і стаў патрошкі разжывацца.

Чалавечак задумаўся, наморшчыў маленькі, як галубінае яечка, лобік і кажа:

— Дапамагу вам. Толькі каб вы заўсёды пачуваліся вольнымі людзьмі, усё сваё роднае шанавалі, не цярпелі прымусу рознай набрыдзі. Пераначуйце вунь пад тым дубам, набярыцеся моцы, заўтра падыміцеся разам з сонейкам, станьце перад ім на калені і доўга маліцеся, кайцеся ў сваіх грахах. Як заслужыце дараванне ад Бога, тады вам будзе яснасць у галовах, як чароўную ваду шукаць.

Падзякавалі людзі маленькаму чалавечку. Ён развітаўся з імі і пайшоў сваёй дарогай, а яны ўмасціліся вакол дуба, праспалі глыбокім сном усю ноч, а раненька памаліліся сонцу. І быў знак з нябёсаў, што трэба свідраваць зямлю каля вёскі, якая называецца Гарывада. Так яны ў той жа дзень і зрабілі. І палілася з нетраў гаручая вада, забіў чорны бліскучы струмень аж пад самае неба. Усе нібы малыя дзеці парабіліся: скакалі, рагаталі, набіралі поўныя прыгаршчы той вады, абмазвалі ёю рукі і твар, і цела...

Прайшло шмат часу... Зараз гэтая вада называецца нафтай. З яе можна рабіць самыя розныя рэчы: бензін, газу, смалу для асфальту і нават тканіны.

Зажылі людзі шчасліва і радасна, паўсюль гучаць родныя песні, а пра злоснага пана-таракана і ягоных наглядчыкаў бацькі расказваюць дзеткам страшныя казкі. Ды хто паверыць, што на такой прыгожай і багатай зямлі, дзе ўсе жывуць у радасці і шчасці, напраўду такое магло быць у далёкай даўніне.

Наташа РАМЕЙКА,
в. Купа, Мінская воб.

Польска-беларуская крыжаванка № 35

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

▶			Rękaw	▶	▼			Kodak
Wieloryb	Trawa	Ranek	▼	Mięta / Sanie		Jar	Marynarz	▼
Królik ▶	▼	▼		▼	╳	Sala	▼	▌
Rzeka / Banan ▶					Tył ▶	▼		
▶					Ara / Ar ▶			
Wampir / Mak ▶					▼			
▶			Irak ▶					╳

Адказ на крыжаванку н-р 31: Іл, ара, шматкі, каштан, вушак, марак, ар. Мёд, кум, шаша, імшар, латка, танк, акно, баніт.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Адрамантаваныя купалы Свята-Троіцкай лаўры

У Расіі

Ехаць у Маскву ці Санкт-Пецярбург? — задумваюцца турысты і паломнікі, калі прыедуць у Расію. Мне давялося наведаць абодва гэтыя гарады. Маскву называюць вялікай будовай. Паміж дамамі з шасцідзесятых і сямідзесятых гадоў узнікаюць велізарныя помнікі сучаснай архітэктуры. У Пецярбургу апошнім часам многа рамантавалася па прычыне падрыхтоўкі да святкавання 300-годдзя існавання горада, які заснаваны быў Пятром I у 1703 годзе.

Мяжу з Беларуссю перасяклі мы побач Чаромхі, бо гэта самы выгадны шлях з Гайнаўкі ў Маскву. Здзівіла нас толькі, што ў рэйкавы аўтобус, якім мы ехалі ў Высока-Літоўск, ніхто не дасеўся. Сказалі нам, што „турысты" з Польшчы ў Беларусь ездзяць на легкавых машынах. Назад вяртаюцца чыгункай, бо ў большай групе лягчэй перавезці „падарункі". Беларускі пагранічнік папярэдзіў, што адпраўляючыся ў Маскву або Пецярбург, трэба паведаміць аб гэтым ужо на мяжы. Па прычыне апошніх тэрактаў вядзецца рэгістрацыя ўсіх прыбываючых у самыя вялікія гарады Расіі. Хаця білеты з Брэста ў Маскву былі даволі дарагія — каля 40 долараў за месца ў купэ — і кожны дзень праязджае па гэтым шляху шмат хуткіх пасажырскіх цягнікоў, але свабодных месцаў было малавата і спаць давялося на верхніх полках. Пасажырамі ў нашым купэ былі расіяне. Наракалі яны на перамены ў сваёй краіне і горшыя чым раней умовы жыцця. Нашы спадарожнікі жывуць у Сібіры, дзе ўсё цяжэй з добрай працай.

Спачатку адправіліся мы ў Сергіева-Троіцкую лаўру. Хацелася патрапіць на святкаванні ў гонар прападобнага Сергія Раданежскага. Усяночныя багаслужбы пачаліся адначасна амаль ва ўсіх храмах лаўры. Прынялі ў іх удзел патрыярх Расіі Алексій II, мітрапаліты, епіскапы і святары. Усю ноч адкрыты быў манастыр, у якім можна было прылажыцца да ікон і мошчаў. Літургіі служыліся ў шматлікіх цэрквах, а на малебен вернікі выйшлі на плошчу перад Свята-Троіцкім саборам. Хоры лаўры захаплялі прыгожасцю спеву. Малітоўнасцю і высокім узроўнем выканання царкоўнай музыкі адзначыўся вядомы ва ўсёй Расіі хор айца Мацвея. Патрыярх Алексій II не служыў малебна з-за хваробы. Выйшаў толькі на балкон і звярнуўся да вернікаў з пропаведдзю. У заходніх сродках масавай інфармацыі паявіліся ўжо нават разважанні наконт ягонага наступніка. Каталікі спадзяюцца, што чарговы патрыярх запросіць у Расію рымскага папу.

Увесь дзень стаяла вялікая чарга да мошчаў прападобнага Сергія, які з'яўляецца заступнікам Расіі і памочнікам у бедах. У Свята-Троіцкім саборы знаходзіцца памятка ад штурму польскіх войск у XVII стагоддзі на лаўру. Адна з куляў прабіла дзверы царквы — можна аглядаць гэта і сёння. Аднак, пасля хадайніцтва прападобнага Сергія, палякі не змаглі заняць лаўру — сімвал праваслаўя. Вернікі заходзілі таксама ў царкву прападобнага Нікана, побач якой знаходзяцца астанкі мошчаў праваслаўных святых з усяго свету. У гэтым памяшканні прападобны Сергій разам са сваім вучнем убачыў Багародзіцу, аб чым сведчыць фрэска. У час святкаванняў вернікі ўбачылі адноўленыя і пазалочаныя купалы цэркваў. Рамантаваліся яны за кошт ахвяраванняў паломнікаў і дзяржаўную датацыю. Рамантаваліся памяшканні духоўнай акадэміі і семінарыі. Аднаўляўся выгляд іканапіснай і рэгенцкай школаў.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Апошнім часам адрамантаваны былі часоўні з крыніцамі прападобнага Сергія

Памяняўся таксама выгляд цэнтра горада Сергіеў Пасад, які камуністы назвалі Загорскам. У адрамантаваных дамах працуюць новыя крамы і гандлёвыя суполкі. Многія рускія прадпрымальнікі рашыліся інвеставаць у гандлёвую дзейнасць, якая не патрабуе такіх вялікіх капіталаўкладанняў як вытворчасць. Большасць тых, хто страціў працу ў нерэнтабельных прадпрыемствах, рашыліся шукаць яе ў Маскве. Даязджаюць яны на працу на цягніках і аўтобусах. Некаторыя развіваюць гандлёвую дзейнасць у сродках грамадскага транспарту. Хаця ў цягніках вісяць паведамленні, што продаж прадуктаў у іх забараняецца, прадаўцы не звяртаюць на гэта ўвагу ды прапануюць шакаладныя ласункі, марожанае, газеты, часопісы, невялікія прылады працы і іншую драбязу. Непадалёк маскоўскіх крамаў стаялі жанчыны, якія прадавалі агародніну і фрукты. Хаця цана ў іх была вышэйшай за тую ў крамах, людзі не хацелі губляць час у чэргах да касаў і куплялі ад іх.

Маскву ўбачылі мы з двух бакоў. Крамы і офісы прадпрыемстваў, якія знаходзіліся ў цэнтры горада, ні ў чым не адрозніваліся ад варшаўскіх. Цэрквы і манастыры, якіх не разбурылі камуністы, рамантаваліся ды распісваліся паводле праектаў з мінулага.

(працяг будзе)

Аляксей Мароз

Якасць паляўнічага

Добрым паляўнічым неабавязкова з'яўляецца той, які заб'е найбольш звярыны. Паляўнічы павінен быць цярплівым і стрыманым — асцярожным і разважлівым — чалавекам, які ведае, калі страляць. Паляўніцтва, гэта дарагое хобі, але не толькі з-за гэтага яго ўдзельнікі павінны галоўным чынам умела страляць.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

З дубальтоўкі страляе на стрэльбішчы Яўген Адамец, лоўчы гуртка „Цецярук" у Кляшчэлях

Паляўнічыя гурткі ў рамках вучэння сваіх членаў штогоду арганізуюць мерапрыемствы, якія называюць гурткавымі спаборніцтвамі або стралковымі вучэннямі. Правяраюцца тады стралецкія ўмеласці паляўнічых ды выпрабоўваецца неабходную па паляўнічым статуце прыстрэлку ружжа з абсталяваным аптычным прыцэлам. Не зважаючы на апошняе патрабаванне, толькі невялікая частка гурткоў арганізуе стралецкія спаборніцтвы, што цягне за сабою мізэрнае знаёмства прынцыпаў стральбы сярод вялікай колькасці стральцоў. Нягледзячы на тое, што вялікі адсотак членаў паляўнічых гурткоў страляе тандэтна, управы гурткоў не прыдаюць гэтаму патрэбнага значэння. Усё яшчэ жыве ў гуртках традыцыя, што *адна „пачка" — адна качка* або здараюцца выпадкі, калі ў час палявання на зайцаў дзеля здабычы 9 зайцаў расходуецца 56 патронаў. А колькі ж мучыцца падстрэленых але не схопленых большых звяроў?

6 ліпеня г.г. паляўнічы гурток „Цецярук" з Кляшчэляў на сваім стрэльбішчы пад Дабрывадай правёў III Стралковыя спаборніцтвы за кубак старшыні гуртка. З агульнага ліку 54 членаў гуртка на старт выйшла толькі 13 стралкоў. Стральба праходзіла ў катэгорыях: бягучыя заяц і дзік ды выкідныя мішэні. Перамог Міхал Казімярук перад Янам Шыманюком і Ежы Боньчакам.

Кляшчэлеўскае стрэльбішча, гэта прафесійны і дагледжаны паляўнічымі аб'ект. За сімвалічную плату на яго ўтрыманне карыстаюцца ім суседнія гурткі: „Падлясяк" з Бельска-Падляшскага, „Дзік" з Чаромхі і „Алень" з Мілейчыч.

— Ці найлепшыя стралкі на стрэльбішчы таксама найлепш страляюць на паляваннях? — пытаю лоўчага Яўгена Адамца.

— Кожны год у нас іншы пераможац спаборніцтваў. На стрэльбішчы стралок мо больш хвалюецца, а на паляванні ён можа больш засяроджаны: стральба там больш прадуманая, да звярыны трэба наблізіцца і... не заўсёды страляецца.

— Як страляеце Вы?

— У час спаборніцтваў я не страляю — працую ў камісіі, даю шанц радавым паляўнічым. А на паляваннях у сёлетнім сезоне застрэліў я тры казлы, і то з першага прыцэлу; значыць страляю метка.

У зводзе прынцыпаў паляўнічай этыкі адзначаецца, што ў час палявання паляўнічы прытрымліваецца памяркоўнасці, каб ягоная заўзятасць не замянілася ў пажадлівасць. Добры паляўнік не заўсёды становіцца пераможцам палявання. Межы паляўнічых этычных нормаў даволі гібкія і толькі ад паляўніка залежыць, як ён іх успрымае.

Міхал Мінцэвіч

Адрамантавалі цэрквы і часоўні

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У адрамантаванай Царкве св. ап. Іаана Багаслова адрэстаўрыравалі іконы і пазалацілі іканастас

На свята мучанікаў Макавеяў ва Узнясенскім прыходзе ў Новым Беразове адбываецца малое асвячэнне вады. 14 жніўня пасля літургіі вернікі адправіліся ва ўрочышча Хітры, дзе ва Узнясенскай часоўні быў адслужаны малебен, пасля якога адбылося і асвячэнне. На свята Праабражэння Гасподняга прыхаджане сабраліся на могілках. У гэты дзень святары паміналі памерлых. Новы прыходскі могільнік заснаваны толькі ў 1925 годзе. Зараз прыход састаўляюць дзесяць вёсак. У мінулым было іх яшчэ больш. Нават людзі з Горнага ці Краскоўшчыны, якія зараз далучаны да Гайнаўкі, маліцца прыходзілі ў Новае Беразова.

З гісторыі

У XVI стагоддзі прыхадская царква была пабудавана ў Старым Беразове і хутчэй за ўсё згарэла разам з жыллёвымі дамамі ў час пажару. Першая драўляная царква ў Новым Беразове была пабудавана ў пачатку XVII стагоддзя на месцы сённяшняй мураванай, акружаў яе могільнік. Другая драўляная царква св. ап. Іаана Багаслова (якая стаіць па сённяшні дзень) пабудавана была ў 1771 годзе. З-за вялікай колькасці вернікаў пабудавалі другую мураваную Узнясенскую царкву, якую асвяцілі ў 1876 годзе — стала яна прыхадской царквой і ад яе ўзялося названне парафіі. У пачатку XX стагоддзя ў прыходзе было 4 399 душ, 5 царкоўна-прыхадскіх школ і 5 школ граматы. Высокага асветніцкага ўзроўню прыход дасягнуў дзякуючы айцу Юліяну Клачкоўскаму, які служыў у Новым Беразове ў 1855-1899 гг. і іншым адданым працы з дзеткамі святарам. Праабражэнская царква — тая, што на могілках — была пабудавана ў 1840 г. каля дарогі ў Чыжыкі. З 1771 г. знаходзіліся там парафіяльныя могілкі. У 1859 г. адкрылі новыя могілкі, распаложаныя каля сённяшніх. На новае месца была перанесена і царква. Мураваную часоўню св. Аляксандра Неўскага збудавалі ў Новым Беразове ў 1867 г., Георгіеўскую часоўню ў Чыжыках — у 1888 г., Узнясенскую часоўню ў Хітрах — у 1888 г.

Аднавілі цэрквы і капліцы

Пабудаваныя ў мінулых стагоддзях цэрквы і часоўні рэдка аднаўляліся. Хаця некаторыя рамонтныя работы вяліся пад наглядам мітрафорнага протаіерэя Сяргея Стальбоўскага, які быў настаяцелем прыхода ў 1955-1993 гг., то яны выдатна ўзмацніліся пры новым настаяцелі — айцу Яўгенію Здраеўскім (з 16 лютага 1993 г.). З 1993 па 1999 год рамантавалася царква св. ап. Іаана Багаслова. Рамонтныя работы вяліся ў царкве за сродкі Ваяводскага рэстаўратара помнікаў. Работнікі памянялі частку даху, падрубаў, некаторыя дылі ў сценах, а астатнія ачысцілі ад грыба і кансервавалі. Была пакладзена новая падлога, адноўлена столь і фрэскі, а царква — памалявана ўсярэдзіне і звонку. За прыхадскія грошы аднаўляліся іконы ў іканастасе і каля яго, залаціўся іканастас, панікадзіла ды аднаўлялася літургічнае начынне. У той жа час рамантавалася часоўня ў Хітрах і пачыналася будова прыхадскога дома. Апрача канцылярыі і прыёмнай будуць у ім 3 кватэры — настаяцелю, вікарыю, псаломшчыку і іх сем'ям. Зараз дом ужо стаіць, кладуцца тынкі ў канцылярыі і кватэры настаяцеля Яўгенія Здраеўскага. Мураваную Узнясенскую царкву рамантавалі за прыхадскія сродкі. Памянялі ў ёй вонкавыя тынкі, памалявалі дах і ўсярэдзіне.

— Ініцыятыва рамонтаў нашых святыняў выйшла ад пакойнага мітрапаліта Васілія і я стараюся ажыццяўляць яго волю. Прыхаджане прыхільна адносяцца да маіх просьбаў, ахвотна ўдзельнічаюць у жыцці прыхода і актыўна ўключаюцца ў рамонтныя работы, за што ім шчырае дзякуй. Моладзь удзельнічае ў хоры. Стараемся павышаць яго ўзровень. У будучыні хацелі б мы яшчэ пазалаціць іканастас ва Узнясенскай царкве, рамантаваць апошнія часоўні і агароджы вакол цэркваў. Бачым, што пасля рамонтаў павышаецца зацікаўленасць паломнікаў і турыстаў нашымі храмамі. Прыязджаюць нават з іншых краін паглядзець нашы святыні, — заяўляе іерэй Яўгеній Здраеўскі.

Настаяцелю дапамагаюць вікарны свяшчэннік, протаіерэй Алім Русіновіч і парафіяне. Хорам кіруе рэгент з Украіны Анна Сімановіч.

Аляксей Мароз

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Іерэй Яўгеній Здраеўскі перад адрамантаванай Узнясенскай царквой

Святкавалі вайскоўцы

На цэнтральныя святкаванні арганізаваныя для Праваслаўнага ардынарыята Польскага войска, якія 10 жніўня адбыліся ў Белавежы, прыбылі генерал брыгады, епіскап Гайнаўскі Міран (Хадакоўскі), генерал дывізіі, палявы біскуп Лешак Славой-Глудзь, прадстаўнік прэзідэнта РП генерал брыгады Тадэвуш Малаковіч, прадстаўнікі Міністэрства нацыянальнай абароны, паасобных вайсковых акругаў, намеснік падляшскага ваяводы Ежы Паўяновіч і прадстаўнікі мясцовых самаўрадаў.

Мерапрыемства пачалося малебнам у Мікалаеўскай царкве ў Белавежы. Епіскап Гайнаўскі Міран у сваім выступленні адклікаўся да бітваў, у час якіх праваслаўныя жаўнеры змагаліся за польскую дзяржаўнасць. У мінулых гадах праваслаўныя святкаванні Дня польскага войска адбываліся ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы. Сёлета рашыліся на Белавежу, каб паказаць польскім генералам і іншым гасцям Белавежскую пушчу.

(ам-з)

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Пасля малебна выступіў епіскап Міран

Царква ў Гарадку

Цяперашні настаяцель а. Мікалай Астапчук выконвае свае абавязкі ад 1 верасня 1990 года. Да парафіі належаць: Гарадок, Бялевічы, Дзернякова, Капцы, Меляшкі, Валілы, Случанка, Страшава, Глейск, Грыбаўцы і Юзэфова. Парафія налічвае каля 2 000 вернікаў.

Звон у царкве важыць 60 пудоў. Купілі яго ў 1899 годзе за амаль 2 тысячы рублёў. Але ад 10 гадоў ён менш чутны ў Гарадку, бо паявілася ў ім трэшчына.

Варта прыгадаць, што сто гадоў таму Гарадоцкая парафія налічвала 15 вёсак і прысёлкаў ды 3 791 душу. Ва ўладанні яе было звыш 110 дзесяцін зямлі.

Янка Целушэцкі



Фота ЯНКІ ЦЕЛУШЭЦКАГА

Наш дом быў побач сінагогі

Успаміны Галіны БАГАЦЭВІЧ з роду Адзіевічаў, народжанай у 1925 годзе ў Орлі.

У верасні 1939 года ў Орлю ўварваліся немцы, усе на матацыклах, і на рынку раздавалі дзецям шакаладкі з каробачак. Збіраліся і гаварылі, што яны не астануцца, а неўзабаве прыйдуць рускія. Сапраўды, праз нейкі час прывалакліся рускія, везлі ўстарэлыя гарматы конскай цягай, быццам пры цары.

Навуку ў школе завяршыла я яшчэ пры санацыі; маючы 13 гадоў скончыла сем класаў. Пасля мама паслала мяне вучыцца на краўчыху, да Фейгі Фукс, арлянскай яўрэйкі. І калі надыходзілі саветы, то мясцовыя людзі цешыліся, прывітальныя брамы стаўлялі, віталі іх. А тая жыдоўка мне кажа так:

— А ты чаго так радуешся?

— Бо то нашы ідут! — адказала я.

— То вашы? — адказала яна мне. — То ідут нашы: віэтэ будэтэ жаты, а мы оно будэм шчытаты!

Вярнулі мяне на два класы — у пяты, і зноў стала хадзіць у школу. У саветаў — у Беларускай няпоўнай сярэдняй школе ў Орлі — было больш прадметаў. На месца польскай мовы была, як родная, уведзена беларуская. Увялі таксама замежныя мовы: рускую і нямецкую.

Даведаліся мы, што арыштавалі дубіцкага бацюшку, бо нехта ўдаў. Пачаліся вывазкі ў Сібір. Помню, што рана, на досвітку, калі падаў снег, вывозілі войта Ваньковіча, які жыў насупраць царквы, і загадчыка школы Тадэвуша Врублеўскага з жонкай Марыяй, якая была настаўніцай, ды з дачушкаю і сынком. Мужчын забіралі асобна ад жанчын з дзецьмі. Не трэба было быць багатым каб вывезлі: за багацце ці палітыку не вывозілі. Бо загадчык школы палітыкай не займаўся. На ягоную пасаду саветы прызначылі нейкага нетутэйшага, які нават не ўмеў па-руску гаварыць, але навучаў.

Я нядаўна сустрэла ў шпіталі жанчыну, каталічку, якую таксама былі вывезлі, і яна сказала мне:

— Савет, калі нас вывозіў, сказаў: „Забірайце ўсё, бо там вам спатрэбіцца, гавару вам шчыра. І не злуйце на нас, бо гэта не мы вас вывозім. Гэта вашы суседзі камандуюць нам, хто багаты ці праціўнік улады. Мо хочуць вам адпомсціць, а мо ваша дабро захапіць". Шкадаваў, што вывозяць, — расказвала тая жанчына і хваліла рускіх, што дапамагалі.

Нашы дзяўчаты, і жыдоўкі таксама, калі прыйшлі ў Орлю „камандзіры", паляцелі на іх зоркі. Праз тыя пагоны страцілі яны цікавасць да нашых хлопцаў.

Калі 22 чэрвеня 1941 года немцы напалі саветаў, то рускія ў Орлі мелі ўсе машыны разабраныя для ачысткі. Некаторых з іх нават жонкі наведалі, а тут Бельск бамбяць. А наша сям'я і яшчэ іншыя нават уцешыліся, бо ўжо былі вызначаны для вывазкі ў Сібір; гаварылі, што нас вывезуць і мы ўжо былі гатовы, тата ўжо нават куфар завязаў.

Немцы пасялілі арлянскіх жыдоў у гета, якое абгарадзілі ад паловы рынка да Кашалёўскай вуліцы. Вызначылі г.зв. „Judenrat". Немцы ўмела падбіралі ад жыдоў іхняе багацце, напрыклад, на вызначаны тэрмін загадвалі назбіраць нейкую колькасць золата, абяцаючы, што тады іх не вывезуць. І яўрэі збіралі тое золата, бо багатыя былі. Пры санацыі ў Орлі быў нават жыдоўскі банк — па тадышняй вуліцы 3 Мая (сёння 1 Мая) — насупраць парку. Па-за тэрыторыю гета яўрэяў не выпускалі, але некаторыя паціху выходзілі. І на практыцы шмат часу ўсе (немцы з жыдамі) добра з сабою жылі.

Усё гэта трывала да часу, аж наехалі жандары і сталі вывозіць. Яўрэі ведалі, што іх чакае, маглі недзе хавацца, але гаварылі, што яны саграшылі. І калі немцы затрубілі, то жыды пакінулі сваіх дзяцей і пайшлі чацвёркамі ў калону. Дзяцей немцы кідалі на грузавікі, старэйшых везлі жалезнымі вазамі. Мелі з сабою клункі, але пакуль праехалі некалькі кіламетраў да Парцава, усё павыкідалі. Пасля тыя торбы немцы пазбіралі ў жыдоўскую школу і разам з мэбляй і іншым яўрэйскім дабром распрадалі жыхарам навакольных вёсак.

У сінагозе немцы зрабілі рамонт, паклалі драўляную падлогу, і паказвалі фільмы або ставілі спектаклі. Пасля людзі расцягнулі адтуль усе дошкі.

Наш дом быў побач сінагогі. На яе даху немцы зрабілі назіральны пункт. Назіральнікам быў Франц — малады нямецкі салдат, якога называлі „пілотам". Заходзіў часам да нас і пытаў, ці я яго баюся. І я баялася, бо гэта ж немец. Але ён гаварыў, што не немец ён, толькі аўстрыец. Я шмат разумела па-нямецку, бо гэтая мова была падобная да яўрэйскай.

18 мая 1943 года павезлі мяне на прымусовыя работы ў Германію. Бацькі вельмі плакалі, што забіраюць мяне. А той Франц зрабіў мне здымак каля бярозак побач нашай хаты, але не даслаў мне пасля ў Германію. Ён стараўся пацешыць мяне, прынёс мне свой здымак.

На прымусовыя работы трапіла я ў вёску Сардынен у павеце Дойч-Эйлау (Ілава). Прымусовыя работнікі былі пазначаны, але не ўсе. Палякі насілі чорную літару „P" на жоўтым фоне, рускія „Ost", французы нічога не мелі і беларусы з Беласточчыны таксама не мелі ніякіх метак.

Саветы вызвалілі нас на зломе лютага і сакавіка 1945 года і адразу ўзялі працаваць у млын у порце Бейлаў. Спярша скіравалі нас на размеркавальны пункт. Насустрач нам ішлі ў напрамку фронту салдаты, якія называлі нас „фрыцаўскімі кукламі". Мы баяліся і я прапанавала маёй польскай сяброўцы Басі схавацца ў нейкую буду. Калісь мяне тата асцерагаў, каб не паказвацца на фронт, не лезці на перадавую, бо тады салдаты як чэрці. Саветы прыдзіраліся да сваіх, чаму не ўцякалі ў партызаны, а да палякаў не чапляліся. Я баялася назвацца палячкай, бо калі б заглянулі ў дакументы...

І так я таўклася ў тым млыне аж да 9 верасня 1945 года. Млын быў высокі, у некалькі ярусаў, і карабель падплываў пад той млын. Я важыла мяшкі, а саветы, у адрозненне ад немцаў, насыпалі іх дапаўна, так што вельмі цяжка было з імі спраўляцца. Палонных немцаў ганялі на працу пад канвоем, а на другую змену выходзілі савецкія салдаты. Трэба было многа мукі і мы яшчэ малацілі нямецкія стагі.

Аднойчы варыла я на плітцы і падышлі да мяне два савецкія важныя рангам афіцэры. Адзін падышоў да мяне і спытаў, адкуль я, ці часам не яўрэйка. Я падтакнула, а ён спытаў, якім чынам я туды трапіла. Я нешта яму адказала і ён, відаць, паверыў, бо зараз даў мне мыла і лякарствы ды запэўніў, што забяспечыць мяне ва ўсё, што мне будзе трэба.

Яўрэі былі салідарныя, не тое што нашы. Мой брат Толя таксама быў на прымусовых работах ва Усходняй Прусіі, і калі прыйшлі саветы, адразу ўзялі яго на перадавую. У Кёнігсбергу ён атрымаў цяжкае раненне і трапіў у шпіталь. І так наглядаў за шпітальным персаналам, дзе лекарамі было шмат жыдоў. А брат, калі яшчэ жыў у Орлі, хадзіў разам з яўрэйскімі дзецьмі вучыцца іх мове, бо ж крыху больш ведаў не пашкодзіць... І гэтыя веды прыгадзіліся. Брат там, у шпіталі, заспяваў адну яўрэйскую песню. Калі пачула гэта медсястра, яна падышла да яго і пацікавілася, адкуль ён ведае гэту песню... І з таго часу так там яго лечылі, каб захутка не вылечыць, каб не вярнуўся на фронт. Такія яўрэі дружныя!

Абрыдла мне працаваць у млыне і я напісала палявой поштай дадому, каб тата прыехаў і забраў мяне, каб у Расію не вывезлі; дакладна напісала, як у мой млын трапіць. І тата прыехаў таварным вагонам ад вугалю, упэцканы. На развітанне ваенны начальнік хацеў нам яшчэ даць мяшок мукі, але мы яе не ўзялі.

Запісаў Міхал Мінцэвіч

Пра мінулае Чаромхі

Чаславу Розбіцкаму 86 гадоў. Больш сарака гадоў перапрацаваў на чыгунцы, зараз на пенсіі. Вось што старажыл расказаў пра мінулае Чаромхі-Станцыі.

Бацька мой у Чаромху прыехаў у 1905 годзе, калі пракладалі чыгунку. Нямнога тады сядзіб тут было. Са старажылаў ён згадваў жыда Мошку ды тутэйшых Коца і Мотыля, а з чыгуначных ветэранаў: Лося, Вяжбіцкага, Вашчука, Лапыша і Бычкоўскага. Крама Мошкі знаходзілася над канавай, дзе пасля пасяліўся Раман Жук. Ягоная крама сапернічала з крамай Солькі, які працаваў у кааператыве „Сполэм". Пакольлі крамы прадавалі аднолькавыя тавары — прадукты ды мяса — жыдоўкі ад Мошкі па хатах хадзілі ды ягоны тавар расхвальвалі. Мясцовыя мяснікі Шміткоўскі і Ветракоўскі жывёлу куплялі, мясныя вырабы рабілі, а затым у сваіх крамах іх прадавалі. Шміткоўскаму сваяк Тамашэўскі дапамагаў у вырабе каўбас. Іхняя крама змяшчалася па вуліцы 1 Мая. У міжваенны перыяд у Чаромху прыехаў Кагачэўскі. Купіў шмат поля, сад і сажалку. Яго маёмасць цягнулася ад цяперашняй вуліцы 1 Мая па Дзібуа, дзе пазней жыў Раман Плахта. Сам уладальнік працаваў на чыгунцы. Па вуліцы 1 Мая знаходзілася двухпавярховая камяніца Маліноўскіх. Пасля вайны яе гаспадары перасяліліся ў Люблін. Ксёндз Сякерка паехаў туды і папрасіў пераняць будынак пад касцёл (раней змяшчалася ў камяніцы шавецкая майстэрня кааператыва інвалідаў, у якім працавалі Долят, Сац і Барташук). Калі гэткі дазвол ад Маліноўскіх ксёндз атрымаў, дык дом разбурылі і на гэтым месцы касцёл узвялі. У пасляваенны час спадарыня Гукоўская вяла ў Чаромсе рэстаран.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

— У армію прызываўся я ў 1938 годзе. Наша часць знаходзілася ў Брэсце. Адтуль перакінулі мяне пад Чанстахову. Непадалёк Кутна быў я паранены ў правую нагу. Пасля перавязкі падаўся далей. Ваяваў у абароне Варшавы. Там трапіў у палон. Перавезлі мяне пад Кёнігсберг, дзе капаў акопы. Дзесяці палонных пільнаваў вахман. Запамяталіся такія мясціны як Кнышын, Асавец і Граева. З надыходам фронту адступалі мы пад Ольштын. Незадоўга апынуўся я ў руках рускіх. Афіцэр заявіў: „Домой". У маёнтку, дзе мы знаходзіліся, забілі вепручка, спяклі хлеб, а прадукты з сабою забралі. Дамоў дабіраўся пехатою. У Бельску спыніла мяне савецкая камендатура — палічылі дэзерцірам. Брат Юзік, калі аб тым даведаўся, дык да палкоўніка ў Чаромху пайшоў і высветліў, хто я такі — адпусцілі. Вярнуўся я тады на сваю сядзібу, да сям'і, ды паступіў працаваць на чыгунку.

Запісаў Уладзімір Сідарук

Фільмавы вечар

Хаця на канікулах большасць нас днём прабывае на паветры, я рэкамендую вам на вечар схадзіць у кінатэатр — гэтым разам у мяне чатыры фільмавыя прапановы.

„Клуб няўдачніц" (Crush) — камедыя Джона Маккея спадабаецца напэўна самотным жанчынам. Тры сяброўкі — паліцыянтка, дырэктарка школы і лекарка — сустракаюцца папляткаваць за віном ды расказваюць аб сваіх любоўных дасягненнях — папраўдзе ніякаватых. 40-гадовыя жанчыны з добрай грамадскай пазіцыяй ды прываблівым выглядам шукаюць чагосьці новага ў жыцці. Аднойчы дырэктарка школы пачынае любоўную прыгоду са сваім былым вучнем — малодшым за яе на 15 гадоў. І хаця сяброўкі супраціўляюцца, прабуюць адмовіць яе ад гэтага, то ўся справа ідзе да шлюбу... Але ці гэтак закончыцца гісторыя?

„Падвойны фарсаж" (2 Fast 2 Furious) аўтарства Джона Сінглетана гэта працяг гісторыі паліцыянта Браена Оконера, які займаўся справай нелегальных аўтамабільных гонак пустымі вуліцамі Лос Анжэлеса. Галоўны герой сам цяпер змагаецца з праблемамі — ён страціў давер сваіх начальнікаў і прабуе даказаць сваю нявіннасць, самастойна арганізуючы паліцэйскую акцыю — пранікае ў мафію, якая займаецца аўтамабільнымі гонкамі. Начальнікі з аднаго боку лічаць гэта поспехам, а з другога — непаслухмянасцю. Апошнім шанцам Браена з'яўляецца акцыя ў Маямі, дзе багаты бізнесмен займаецца нелегальнымі інтарэсамі. Дапамагаць Браену будуць прыгожая Моніка і сябар з дзяцінства, але не ўсё адбываецца так як задумаў сабе Браен.

„Скажы гэта Габі" Рональда Равінскага з Мартай Харадоўскай, Магдалінай Цялецкай, Анджэем Хырам і Янам Фрычам у галоўных ролях — апошняя польская прадукцыя, якая заваёўвае сэрцы кінааматараў. Гісторыя простая, што аж празаічная. Маладая дзяўчына Габі ўлюбляецца ў журналіста. Каб завязаць з ім знаёмства, пачынае хадзіць за ім крок у крок. Праблема ў тым, што ў Барыса ёсць ужо нарачоная. Але, калі Барыс сустракае Габі ў сваёй хаце, пачынаюцца прыгоды. У той жа час Барысаў шэф, які хварэе ракам, уцягвае журналіста ў нелегальныя інтарэсы, але з'яўляецца і „добры анёл", які дапамагае галоўнаму герою.

На канец прапанова любіцелям прыроды — „Кіты" (Whales). Аўтары паказалі ў фільме свет найбольшых звяроў нашай зямлі. У час здымка да фільма аквалангісты сходзілі без сваёй апаратуры дваццаць метраў углыб, каб не палохаць звяроў шумам бурбалак. Фільм з'яўляецца сапраўдным „цудам", якога не выпадае абмінуць.

Паўліна Шафран

Грыбы, лес і людзі

Нікому не трэба расхвальваць смаку грыбоў. Няма хіба другой такой краіны ў свеце, дзе б грыбам прысвячалася столькі часу ды з такім задорам. Лідзіруем у свеце таксама, на жаль, у колькасці атручэнняў грыбамі.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Ядавіты мухамор

Ядавітыя грыбы кожны год збіраюць трагічны ўраджай і таму неабходная найбольшая асцярожнасць у час іх збірання і кулінарнай апрацоўкі. Заўсёды лепш назбіраць менш грыбоў, але вядомых, чым многа, але недакладна апазнаных.

Мяркуецца, што на тэрыторыі нашай краіны расце звыш чвэрці мільёна відаў грыбоў. Вывучана іх намнога менш, аднак лік апошніх з кожным годам расце ў маштабе Еўропы на прыблізна 2 тысячы. Яны з'яўляюцца неад'емнай часткай дасканалай прыроднай сістэмы і адыгрываюць падставовую глебатворчую ролю ў лясах. У ходзе сваіх жыццёвых працэсаў, нягледзячы на невялікія памеры, выдзяляюць у дзесяць разоў больш двухвокісу вугалю чым усе людзі на свеце.

У апошнія гады наглядаецца значнае хістанне ўраджаяў паасобных гатункаў грыбоў, а нават зніканне, як у выпадку баравікоў. Сярод многіх прычын гэтых з'яў галоўнай з'яўляецца парушэнне біялагічнай раўнавагі нашых лясоў (прамысловыя забруджанні, ападкі кіслых дажджоў, убытак старых дрэў) ды недарэчнае і празмернае выкарыстанне грыбных месц — фактар вельмі важны і ў значнай меры залежыць ён ад кожнага з нас.

Міхал Мінцэвіч

Фота КРЫСТЫНЫ КАСЦЕВІЧ

Каля смачнага мёду пераможца конкурсу Ян Савіцкі (справа) з жонкай

Мядовы фэст

Белавежскі аддзел Польскага турыстычна-краязнаўчага таварыства арганізаў 16 жніўня ў Белавежы II Мядовы фэст. Жыхары Белавежы і турысты маглі галасаваць за свой улюбёны мёд з 17 пасекаў. Публіка вырашыла, што самы лепшы ліпавы мёд Яна Савіцкага з Белавежы. На другім месцы апынуўся мёд Яўгена Плашчука з Трасцянкі, а на трэцім — Яна Вільчэўскага з Гайнаўкі.

Ян Савіцкі з пчоламі працуе каля трыццаці гадоў. Зараз у яго трыццаць два вулеі, а галоўная пасека знаходзіцца каля запаведніка Белавежскага нацыянальнага парку. У мінулагодняга пераможцы Яна Вільчэўскага 120 вуллёў, якія ставіць у розных месцах Белавежскай пушчы і яе наваколлі. Некаторыя знаходзяцца ў больш адлеглых месцах Падляшскага ваяводства.

— Белавежская пушча, гэта экалогія і квітнеючыя паляны. Мёд, які сёння паказваем, характэрны нашаму рэгіёну, — заявіў старшыня Белавежскага аддзела ПТКТ Аляксандр Вашкевіч. — Сёлета святкуем досыць сціпла, але ёсць надзея, што мядовае мерапрыемства з дапамогай войта будзе і большым, і пастаянным.

Пчолы з навакольных пасек таксама наведалі фэст і сталі „прымяркоўвацца" да тых асоб, якія круціліся ля мёду. На шчасце ніхто не пацярпеў, пчол адпудзілі і конкурс можна было працягваць. Турысты маглі яшчэ паласавацца законкурсным мёдам Польскага пчалярскага саюза і даведацца пра мядовыя крамы. Наведвальнікі фэсту куплялі розныя віды васковых свечак. Зараз у Падляшскім ваяводстве да Польскага пчалярскага саюза належыць каля 350 асоб, якія карыстаюцца саюзнымі крамамі дзеля продажу мёду. Меншыя пчаляры не рэгіструюцца і прадаюць мёд пастаянным пакупнікам або на мясцовых базарах. Мёд з наваколля Белавежскай пушчы ахвотна купляюць па прычыне яго высокай якасці. Многія лічаць, што з'яўляецца ён экалагічным прадуктам.

Аляксей Мароз

Больш талерантнасці

Да нядаўна на базарах Беласточчыны многае можна было купіць у рускіх гандляроў — ад прадуктаў, пасуды і электрапрыбораў па спіртное і цыгарэты. Усё гэта яны танней прадавалі, польскі грош імі цаніўся, ды і нам выгада была. Зараз менш прадаўцоў з-за мяжы прыязджае. Кажуць, палякі з рынку праганяюць, бо сваім купцам канкурэнцыю робяць. Вось, прыклад з Гайнаўкі. У сераду перад *галямі* не сустрэнеш рускага з таварам. Некалькі смельчакоў скрыліся за будынкам каля агароджы. Ды ў гэтых малы выбар тавару — запалкі, лаўровы ліст, парфума, крыху галантэрыі і касметыкі. Не гавару пра тых, якія цішком прапануюць спіртное і цыгарэты палякам, якія праходзяць каля прылаўкаў. У Бельск-Падляшскі прыязджае крыху больш прадаўцоў з Гродна. Знаёмы купец з Маліннікаў сказаў, што ў Кляшчэлях рускіх выганялі з базару. Я рашыў сам гэта праверыць.

— Не заўважыла я, каб рускіх праганялі, — патлумачыла мне жонка прыяцеля, якая прадае на базары галантэрыю. — Два тыдні таму двух рускіх пагранічнікі ў Чаромху адвезлі. Казалі, што ў Беларусь дэпартавалі. Але прычыны ніхто не ведае.

Аб тым, што некаторыя польскія купцы неакуратна ставяцца да суседзяў з-за мяжы, я сам пераканаўся. Было гэта 16 жніўня ў Чаромсе. Калі прыезджая „купчыха" хацела заняць месца побач беларускай жанчыны і пачула, што гэтае месца занятае, не скрываючы непрыхільнасці прасіпела: „Przyjadą tu jacyś i rządzą jak u siebie w domu". А яна хто такая чарамшанам? Таксама „якаясьці там". Мне здаецца, што кожны хто плаціць базарны ўзнос у гмінную касу — роўны, і таму ў справе месцаў хто першы, той і лепшы. У сваю чаргу хачу паставіць пытанне:

— Ці пасля ўваходу Польшчы ў Еўрасаюз, калі заедзем да суседзяў на Захад, на базарах будуць таксама паглядаць на нас як на няпрошаных гасцей ці нахабнікаў? Прыемна будзе нам?

Больш талерантнасці, даражэнькія.

Уладзімір Сідарук

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2003 r. upływa 5 września 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Ніколі не паддавацца

„Даўціпы" *Андрэя Гаўрылюка*

Мікалай ажаніўся паўторна. У пасляшлюбную ноч прызнаецца жонцы:

— Я не гаварыў табе, што часта бываю беспрычынна раўнівы.

— Не турбуйся, — супакойвае яго жонка, — я пастараюся за прычыны.

* * *

У адсутнасць мужа жонка забаўлялася ў спальні з каханкам. Неспадзявана пачула, што адкрываюцца дзверы, кашлянуў муж. Яна імгненна нашмаравала каханка крэмам, пасыпала талькам, паставіла ў куток і загадала не варушыцца без яе дазволу. Праз хвіліну ў спальні паказаўся муж:

— Што гэта такое? — спытаў, пабачыўшы новы аб'ект.

— Гэта прыгожая статуя: Кавальскія маюць такую рэч дык і я купіла.

Муж прыняў тлумачэнне жонкі з павагай, пра нішто больш не распытваў і лёг спаць. Раніцай устаў, пайшоў у кухню і праз хвіліну вярнуўся з бутэлькай піва і бутэрбродам. Падае гэта жончынаму каханку:

— Бяры, еж; у Кавальскіх стаяў я так трое сутак і ніхто мне нават шклянкі вады не падаў.

* * *

Кавальскія ўжо больш дзесяці гадоў жывуць у сужонстве, аднак, няма ў іх дзяцей. Паверхам вышэй жывуць маладыя суседзі, у якіх пяцёра дзяцей. Аднойчы Кавальская спыняе суседа на лесвіцы:

— Якая прыгожая і вялікая ваша сям'я! Нам такое не ўдаецца...

— Гэта справа нескладаная. Купіце сабе чорную карункавую бялізну, добрую парфуму і мятлу.

— А навошта мятла?

— Пастукаць ёю ў столь, калі мужа не будзе ў хаце...

Адгаданка

	1	2	3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26	27	28	29

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм.

1. вузкі стальны брус на чыгуначным пуці = 11 __ 19 __ 15 __ 21 __ 17 __;
2. кароткая прылада з патоўшчаным круглым канцом для таўчэння = 10 __ 14 __ 23 __ 28 __ 6 __ 7 __;
3. горад з папскай дзяржавай = 18 __ 12 __ 13 __;
4. зброя рыцара = 1 __ 3 __ 27 __;
5. заліўная сенажаць = 20 __ 29 __ 24 __;
6. змацоўвае аглоблі з хамутом = 5 __ 22 __ 16 __ 2 __;
7. каршун = 4 __ 9 __ 25 __ 26 __ 8 __;

(ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 28 нумара

Адзін у полі не воін.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Антону Казлоўскаму** з Калодна і **Мікалаю Раманюку** з Гайнаўкі.

Мяне на сенатара!

Мяне, у сэнсе, Вандала А. Гэтак рашыла мая Агата А., якая часова ў Паўночнай Амерыцы. Яна раз у ЗША, раз у Канадзе — адтуль шле мне паштоўкі, электронныя лісты і развагі на паперы, калі ёй ноччу не спіцца — азваўся, здаецца, у ёй нейкі літаратурны талент. Не мае з кім гаварыць, дык сама з сабою пачынае. І піша. Здаецца, такі заўсёды пачатак літаратурнай працы — ахвота паспавядацца каму разумнаму. Яшчэ што, ды і ў агульнапольскім беларускім конкурсе прыме ўдзел. А раз прыслала мне ліст, які трэба было расшыфроўваць. Паколькі ў той час я быў у Пінску ў гасцях у нашай сяброўкі Ніны, не адразу зразумеў, у чым справа і чаму мая жонка спрабавала яшчэ раз пакалупацца ў маім розуме ды праверыць, ці я не здзяцінеў.

Пісала гэтак: „Вандал, а, можа, на сенатара цябе? І ў хаце быў бы ты радзей, і суседкі зайздросцілі б мне? Перастаў бы ты дурнотамі займацца ў „Гібе". Сноўку. Можа, уступіў бы ты яшчэ раз у СФД, як твой знаёмы Харэк з Фомжы, або, як той Хазалеўскі, баронам стаў бы чагосьці? Жывеш у гэтым Леластоку, і ніхто, апрача жменькі людзей, не ведае цябе як таго У. Ліля-Ярузэльскага. А ж з бацькам ягоным, старым Лілем, сябраваў ты. У часы КМС сядзелі ўсё-ткі розныя на пасадах на Шадляшшы, а ты, як не сядзеў, так і не сядзіш, не сеўшы. Цеафіцыйна трэба справу паставіць. Ты трохі такі і з ШШС, і з СФД. Каб, можа, быў уступіў ты ў Фігу ПС, або ў ШыЗ, меў бы ў самім Леластоку большае павадзэнне, хоць у былым Леластоцкім ваяводстве шанцы меў бы меншыя. Хоць, цяперака, нічога невядома. Злітны электарат летась аддаў 26 галасоў нават на МакХолада на Леларускі камітэт. Кнтон Хірановіч ды Яўген Мапа прапанавалі ж табе, каб пайшоў ім у падтрымку, а ты адно жартуеш. Ну, глянь на апошнія выбары! Марта прыгледзецца і падумаць, абмеркаваць, ці ісці з леларусамі, ці з Фігай п-сем'яў, ці з Хечыславам Лагінскім з Фомжы. Чорт адзін ведае, як справы пойдуць. Ласка леластоцкіх выбаршчыкаў на рабым каню ездзіць. Скажыце контркандыдатам: Дармо, Ясю, ходзіш! Дармо ножкі б'еш! Шправядлівасць ды закон мае запанаваць! А не, па прынцыпе ШыЗ, накарміць яшчэ аднаго свайго члена! Калі што, звані МакХоладу ці А. Мярліцуі".

Сеў у фатэль, глытнуў халоднае кавы (астыла, пакуль чытаў Агацін ліст), і давай ламаць над шыфроўкай свае мазгі. Пазваніў Колю. Здунюк агрызнуўся: „Гэта практыкаванне на твае мазгі, не на мае!" Збышка паехаў быў на сваю пасеку, дык прыйшлося выклікаць МакХолада. Той адразу прыехаў на 19-м атобусе, разам са сваёй сучкай (тая — у госці да мае Гарэшкі).

— Спадар ВаІдал, я Іе разбіраюся ў гэткай шыфроўцы. Здаецца, хтосьці тут пераблытаў літары, пэўІа, тэхІка Іаша і іхІяй Іе стыкуюцца. Бо ж справа, пэўІа, Іе ў тым, што ваша жоІка хоча праверыць ваш розум. Можа, гэта звычайІая правакацыя? Іаліце кілішак, бо без гарэлкі Іе разбярэшся.

— Я табе Іалью! Іалью табе гарэлкі, як табе Сакрат ЯІовіч Іаліў! Кубак бляшаІы чыстае КрыІкі! Я меў Іадзею, МакХолад, што хоць ты расчытаеш гэтыя дурІоты!

— Якія дурІоты! Я Іе супраць, каб вы сталі сеІатарам! Іду збіраць галасы!

Вандал Арлянскі

Метафізічны гук парыву

Бледным світанкам перад чарговым сходам уселяснога кіраўніцтва мядзведзя Сандара Жоржавіча агарнула вялікая жрачка. Дарваўся нават да зімовых запасаў, якія, як даніну, зносіла яму лясная брацыя, быццам суворыя маразы мелі надысці. А то ж цяпер у двухногіх толькі што час жніва! Мядзведзь напіхаўся харчом, аж урэшце і сам спух.

— Ужо больш не змагу, — сказаў сам сабе, выказваючы прытым гук, які зварухнуў нават самыя адлеглыя ад мядзведжай бярлогі дрэвы. — Не можа жыць братва адной жратвою. Трэба нам светлай думкі, ідэй вялікіх.

Тым часам на паляне якраз сабралася рэшта кіраўніцтва.

— Ці і вы чулі хвіліну таму той метафізічны гук, быццам гук парыву? — запыталася ў рэшты кіраўнічага актыву лань Гаўрусіха.

— Гэта было такое хвалюючае, што, калі б не мой хвост, якім я зачапілася за хвойку, дык грымнула б вобзем! — зацакатала ўзрушаная Кацюша.

Барсук Барушчук дадаў:

— А прытым той казачны арамат, што разышоўся з гэтым гукам... Ах, ах!..

Толькі дзяцел Стукач нічога не сказаў. Глыбока ўбіў дзюбу ў дуб, на якім традыцыйна сядзеў, захіліўшыся крылом ад ветру.

Праз хвіліну кіраўніцтва пачула цяжкае „ух-ух". Усе дадумаліся, што гэта мядзведзь крочыць у іх бок.

— Бедны наш мядзведзік. Як цяжка яму пад навалай думак і лясных клопатаў, — спачувальна ўздыхнула лань Гаўрусіха.

Мядзведзь урэшце рассеўся на імху. Ціснучы лапай набрынялае жываціска, пачаў сход.

— Нельга толькі ўсё жэрці, жэрці і думаць каб нажэрціся. Трэба нам ідэі вялікай ды пекнай, компасу для лясное браціі. Трэба пранікаць у душы і розумы нашай звярыны, вось дык дакажам гэтым з Уладзімірскага лесу, што лясною сілай не адно змаганне за падлу.

— Значыць, дыета?.. — прашаптала Кацюша.

— Ну, вось, вавёрка, а вы толькі аб адным. А тут трэба думкі над дабром лясное супольнасці, каб былі мы духоўным лідэрам лясных цывілізацый. Звярынага духа нельга тушыць.

Барсук Барушчук задумаўся: „Тушыць? Дажджу ад месяца не было, значыць, нічога не пагасне".

Сандар Жоржавіч закончыў выступленне:

— Загадваю ўвядзенне Дзён інфармавання лясное браціі аб неабходнасці жыцця вялікай ідэяй. Яна — наша страва. Калі пачнуць разумець вялікую ідэю, і самі стануць вялікшымі.

Мядзведзь загадаў ды вярнуўся ў сваю бярлогу. Рэшта кіраўніцтва разбрылася па ўзлесках уводзіць у жыццё новую ініцыятыву.

На ўскраіне лесу змяя Ссапія, вуж Ззянон ды дзік Свіналыч доўга раздумвалі, што гэта за такі гук ды пах дайшоў да іх з лясного цэнтра. Свіналыч, былы член кіраўніцтва, адсунуты ад яго мядзведзем, добра ведаў, што гэта такое.

— На мой нюх, нічога добрага гэта не прадказвае. Выдатна ведаю такую смуродзінку. Набліжаецца пост па размеркавальніку.

МакХолад

ISSN 0546-1960